Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ЧЭРВЕНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 117 (27975) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Мільёны ў вёдрах

СТАР. 5

Педагогі новага часу

СТАР. 6

Абнавілі сімвал горада

СТАР. 8

ЦЫТАТА ДНЯ

Тарас НАДОЛЬНЫ, першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:

«Працэнтныя стаўкі адлюстроўваюць эканамічную сітуацыю, гэта значыць сёння ў краіне дастаткова дарагія дэпазітныя стаўкі для таго, каб узмацніць зберажэнні ў беларускіх рублях, а высокая дэпазітная стаўка падцягвае за сабой крэдытную стаўку, таму што дэпазіты і насельніцтва, і юрыдычных асоб — гэта рэсурсы для выдачы крэдытаў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.06.2015 г.

Долар ЗША	15318,00	▲
Еўра	17331,00	▼
Рас. руб.	285,44	▲
Укр. грыўня	704,28	▲

ISSN 1990 - 763X

Мір і згода ў грамадстве — духоўны стрыжань нашай краіны

ДЗЕЛЯ ГАЛОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ

Падчас візіту Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла гэтыя словы былі, можна сказаць, лейтматывам. Пра гэта ў першую чаргу гаварыў і Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з прадстаяцелем Рускай Праваслаўнай Царквы.

У нашай краіне шануюць і берагуць адсутнасць праблем ва ўзаемаадносінах прадстаўнікоў розных канфесій, адзначыў Прэзідэнт. Сустрэча праходзіла напярэдадні паездкі патрыярха ў Брэст, і кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што на поўдні краіны пражывае шмат каталікоў. «Праваслаўе і там, на заходніх межах нашай краіны, як ніколі магутнае. Каталікі і праваслаўныя жывуць вельмі мірна, у нас няма ніякіх адзін да аднаго прэтэнзій, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы стараемся дапамагчы адным і другім, каб людзям было зручна і каб кожны знайшоў сваю дарогу да храма».

У Беларусі жывуць прадстаўнікі розных веравызнанняў, у пытаннях рэлігіі «людзі самі вырашаюць, дзе ім быць, як ім быць», падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. У краіне цэняць адсутнасць праблем ва ўзаемаадносінах вернікаў і маюць намер захоўваць такое становішча рэчаў, адзначыў Прэзідэнт. «Я не бачу ніякіх праблем ва ўзаемаадносінах нашых вернікаў. Мы гэта вельмі цэнім і будзем берагчы, наколькі гэта магчыма», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Важнасць гэтага даказвае сітуацыя ва Украіне. Канфлікт тут пачаўся менавіта з расколу ў царкве, «калі былі страчаны духоўныя каштоўнасці, калі іх сталі таптаць». «Усё гэта перайшло ў плоскасць ужо ваеннага супрацьстаяння», — заявіў беларускі лідар.

СТАР. 2

Фота БЕЛТА.

■ Надвор'е

ТЫДЗЕНЬ ЛЕТНІХ ДАЖДЖОЎ

На паўднёвым усходзе краіны яшчэ захаваецца пажаранебяспечнае становішча

На гэтым тыдні чакаецца няўстойлівае і цёплае надвор'е, з сярэдняй тэмпературай паветра каля нормы, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі Дзмітрый РАБАЎ.

Гэтымі днямі ў нас будуць гаспадарыць малаактыўныя атмасферныя франты з Заходняй і Паўночна-Заходняй Еўропы. Яшчэ сёння ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, аднак удзень у заходніх раёнах пачне адчувацца ўплыў франтальных падзелаў. Таму пераважна без ападкаў, толькі ўдзень па захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Максімальная тэмпература паветра складзе 17-24 цяпла, а па паўднёвым усходзе Беларусі паветра прагрэецца да плюс 27 градусаў. Уначы на сераду на большай частцы, а ўдзень месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 9-16 цяпла, удзень — плюс 17-23 градусы, а па ўсходзе краіны — 24-27 цяпла.

І надалей да канца тыдня ў Беларусі будзе гаспадарыць няўстойлівае і вільготнае паветра з боку Заходняй Еўропы. У чацвер месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 8-15 цяпла, удзень — плюс 17 -23 градусы, па ўсходзе — 24-26 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу і суботу месцамі таксама прагназуюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы стане крыху халадней, калі тэмпература паветра чакаецца ў межах 6-13 цяпла, удзень будзе плюс 17-23 градусы, але па ўсходзе краіны ўначы прагназуецца плюс 14 -15 градусаў, а ўдзень месцамі да 24-26 цяпла.

Асобна спецыяліст адзначыў, што мінулыя дажджы значна палепшылі пажаранебяспечную сітуацыю па заходняй палове краіны, аднак на ўсходзе ўсё яшчэ захоўваецца складанае становішча. Напрыклад, у Мазырскім раёне застаецца апошні, пяты клас небяспекі. Кароткачасовыя і невялікія дажджы, якія будуць на гэтым тыдні, а таксама нераўнамернае іх размеркаванне па тэрыторыі краіны, пажаранебяспечную сітуацыю па паўднёвым усходзе краіны істотна не палепшаць, упэўнены Дзмітрый Рабаў.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2015 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

ДЗЕЛЯ ГАЛОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што міратворчая місія Беларусі па ўрэгуляванні сітуацыі ва Украіне вядомая. «Ад яе нікуды не дзенешся. Мы браты — рускія, беларусы, украінцы, мы ад аднаго кораня. Нам балюча, калі адбываецца бяда ў нашых братоў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы будзем усё рабіць для таго, каб неяк змякчыць сітуацыю, а калі магчыма, і спыніць гэтую братазабойчую вайну».

Прэзідэнт выказаў падзяку патрыярху Кірылу за ўсё, што ён робіць для Беларусі. У краіне ўсе выдатна ведаюць падзвіжніцкую ролю патрыярха, яго стаўленне да краіны. Паводле яго слоў, патрыярх Кірыл неаднаразова бываў у нашай краіне і мог на свае вочы пераканацца, наколькі адданыя беларусы духоўным караням і каштоўнасцям.

Патрыярх Кірыл у сваю чаргу падзякаваў Беларусі за ролю ў арганізацыі перамоў па ўрэгуляванні сітуацыі ва Украіне. Па словах настаяцеля РПЦ, тое, што адбываецца цяпер ва Украіне, брацкай краіне, з'яўляецца для яго вялікім жалем. «Гэта сапраўды рана на сэрцы, — сказаў патрыярх. — Праваслаўная кананічная царква мае ў сваёй паставе людзей як з усходу, так і з захаду. Гэта накладвае зусім асаблівую адказнасць на царкву».

«Сёння наша царква з'яўляецца адзінай арганізацыяй ва Украіне і адзінай сілай, якая захавала міратворчы патэнцыял, таму што яна сябе не атаясамляе ні з аднымі, ні з другімі», — падкрэсліў Патрыярх Кірыл. Ён заявіў, што немагчыма падзяліць паству па палітычным прынцыпе: «І там, і там праваслаўныя людзі; і там, і там пакутуюць, гінуць».

Настаяцель РПЦ расказаў, што асабліва хацеў наведаць Беларусь у год 70-годдзя Перамогі. Ён адзначыў, што кожны раз, калі наведвае краіну, адчувае цёплыя і радасныя пачуцці. «Але, акрамя таго, ступаючы на беларускую зямлю, заўсёды ўспамінаеш асаблівы ўклад Беларусі ў абарону Айчыны ў апошняй вялікай вайне», — сказаў патрыярх Кірыл.

Патрыярх падзякаваў за магчымасць наведаць Брэсцкую крэпасць, ля сцен якой загінуў яго дзядзька. «Гэта святое месца з'яўляецца ўзорам гераізму, адвагі, здольнасці людзей не проста да канца сваіх фізічных сіл, а звыш усялякіх фізічных магчымасцяў змагацца з ворагам і быць верным прысязе», — сказаў ён.

Падчас сустрэчы Патрыярх Кірыл уручыў Прэзідэнту Беларусі ордэн прападобнага Серафіма Сароўскага I ступені, а таксама перадаў у дар абраз святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падараваў патрыярху ікону «Анёл-ахоўнік». Яна ўяўляе сабой рэльефную выяву анёла, выкананую з серабра ў тэхніцы чаканкі. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы правёў для патрыярха кароткую экскурсію па залах Палаца незалежнасці, дзе праходзіла сустрэча.

БЛАСЛАВЕННЕ АД ПАТРЫЯРХА

Прадстаяцель Рускай Праваслаўнай Царквы прыляцеў у аэрапорт «Мінск» з добрым настроем. Па яго словах, так адбываецца шораз. «Наведванне Беларусі, якая з'яўляецца каштоўным каменем у кароне праваслаўных хрысціянскіх народаў, для мяне вельмі важнае і па-чалавечы радаснае», — падзяліўся ўладыка.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Далей патрыярха чакалі на Плошчы Перамогі, дзе ён усклаў вянок да абеліска і звярнуўся да прысутных з прамовай, у якой блаславіў беларускую зямлю: «Успамінаючы ўсіх, хто загінуў у час вайны, мы адначасова просім Госпада, каб Ён дараваў мір Беларусі, Расіі, Украіне і ўсім братэрскім краінам, якія, жывучы ў адзінай дзяржаве, прынеслі свету Вялікую Перамогу і вызваленне ад страшнага ворага. Няхай блаславенне Божае жыве над горадам Мінскам і над беларускай зямлёй».

ЧАС ДЛЯ МАЛІТВЫ

Асноўная частка мінскага дня візіту адбылася ў Свята-Духавым кафедральным саборы, дзе патрыярх правіў набажэнства. Унутр храма ўмясціліся не ўсе, і таму большая частка (некалькі тысяч) вернікаў запоўніла ўзгорыстую ваколіцу. Для іх быў усталяваны на вуліцы экран. Нягледзячы на пахмурнае і даволі ветранае надвор'е, большасць прысутных адстаялі да канца набажэнства. З храма вялася і прамая трансляцыя для прыхільнікаў назіраць за службай з экранаў тэлевізараў.

Напрыканцы набажэнства іерархі сказалі пропаведзь. Пачаў яе Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі: «Мы будзем успамінаць самыя страшныя дні пачатку вайны. Прайшло 74 гады, але памяць пра гэта захоўваецца ў сэрцах і свядомасці ўсіх жыхароў Беларусі. Ён таксама звярнуў увагу на святкаванне 1000-годдзя спачыну святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра. «Мы кажам, што гэта свята, таму што ў Бога няма мёртвых, у Бога ўсе жывыя», — растлумачыў кіраўнік БПЦ і ўручыў патрыярху абраз святога Кірыла, епіскапа Тураўскага, а таксама архірэйскае адзенне.

«Калі паўстала пытанне пра тое, каб патрыярх узначаліў урачыстасці ў сталіцы Беларусі, мне падалося, што зручней за ўсё гэта зрабіць у дзень, калі мы ўспамінаем усіх беларускіх святых», — патлумачыў Святейшы. У сваёй прамове ён закрануў усё тыя ж тэмы-нагоды да свайго прыезду: 70-я гадавіна Перамогі, святкаванне памяці Сабора беларускіх святых і 1000-годдзе спачыну хрысціцеля Русі. Кажучы пра князя Уладзіміра, уладыка падкрэсліў, што той «аб'яднаў раз'яднаныя славянскія плямёны не толькі сілай дзяржаўнай улады», але і агульнай духоўнасцю. Бо другое дапамагае трымаць адзінства на вялікай геаграфічнай прасторы нічым іншым не аб'яднаных людзей.

ПУНКТ ЗБОРУ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ДУХОЎНАСЦІ

Пасля асвячэння Духоўна-адукацыйнага цэнтра Беларускай Праваслаўнай Царквы, у стварэнні якога ўдзельнічалі дзяржава і Прэзідэнт, адбылося гашэнне маркі з нагоды 1000-годдзя спачыну святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра. Яго ў тры рукі зрабілі Святейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел і віцэ-прэм'ер Беларусі Наталля Качанава.

У адным з пакояў Духоўна-адукацыйнага цэнтра прайшла сустрэча з беларускімі лаўрэатамі міжнароднага грантавага конкурсу «Праваслаўная ініцыятыва». Адна з мінулых пераможцаў Вера Сярдзюк, кіраўнік Цэнтра падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля», расказала, што дзякуючы праграме здзейснілася адна з яе задум. Сёлета ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі паступіў законапраект, згодна з якім кожная жанчына, якая вырашыла зрабіць аборт, мае права на псіхалагічную кансультацыю ад установы аховы здароўя, а доктар можа адмовіцца ад гэтай аперацыі. У сваю чаргу Патрыярх расказаў, што ў Расіі для змагання з абортамі створаны пры праваслаўных цэнтрах прытулкі для жанчын, якія вырашылі пакінуць дзіця, а не пазбавіцца ад яго. Такім чынам было выратавана болей за 15 тысяч новых жыццяў.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

Напрыканцы прадстаяцель асвяціў скульптурную кампазіцыю ў памяць аб з'яўленні абраза Багародзіцы на рацэ Свіслач у 1500 годзе. Калісьці святы роўнаапостальны князь Уладзімір перанёс ікону з Херсанеса ў Кіеў, адкуль яна знікла і была зноў знойдзена ў сучаснай беларускай сталіцы. Таму яе часцей за ўсё клічуць «Мінскай». Сама скульптура сімвалізуе рачную плынь, напрыканцы якой ладдзя ў форме птушкі, а ў ёй — сам абраз.

СІМВАЛ АДЗІНСТВА І ПЕРААДОЛЕННЯ

Прадстаяцель Рускай Праваслаўнай Царквы ў Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны маліўся ў Брэсце

Візіт прадстаяцеля Рускай Праваслаўнай Царквы ў Брэст пачаўся раніцай у нядзелю. У Свята-Уваскрасенскім саборы ўладыку чакалі многія тысячы вернікаў. Храм змог змясціць крыху больш за дзве тысячы чалавек. Астатнія глядзелі прамую трансляцыю са службы на загадзя зманціраваных экранах.

Патрыярх правёў Боскую літургію ў дзень свята Сабора Беларускіх святых — такіх, як Еўфрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі, Сімяон Полацкі і іншыя. Яшчэ малітва была ўзнесена ў гонар роўнаапостальнага князя Уладзіміра, хрысціцеля Русі, бо 21 чэрвеня праваслаўная царква адзначала 1000-годдзе з дня ўпакаення гэтага святога. Дарэчы, Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі прывёз у Брэст каўчэг з часцінкай мошчаў святога князя Уладзіміра. Мошчы прабудуць у саборы яшчэ два дні.

Звяртаючыся да вернікаў Патрыярх Кірыл сказаў: «Мы знаходзімся на самым заходнім памежжы Русі, якую летапісцы назвалі Святой Руссю. І называлі так не таму, што нашы людзі былі свяцейшымі за іншых. Святасць была нашым агульным нацыянальным ідэалам... І сёння гэты вялікі ідэал, зэяючы прыгажосцю, прыцягвае разумных людзей, здольных мысліць і адрозніваць дабро ад зла». Менавіта ў імкненні да ідэала заключаецца сіла і непераможнасць народа», — лічыць Кірыл.

Закрануў у сваім пастырскім слове ўладыка і тэму Вялікай Айчыннай вайны. Сказаў, што перамога над фашызмам стала наймагутнейшым адраджэннем праваслаўнай веры, якая перажыла найцяжэйшыя часы, звязаныя з закрыццём цэркваў, разбурэннем манастыроў, расстрэламі і ссылкамі святароў. «У акопах на перадавой не было няверуючых», — заўважыў ён.

Не было іх і ў Брэсцкай крэпасці, якая першай на сабе адчула націск ворага. Менавіта сюды ўжо шмат гадоў прыходзяць брастаўчане, каб перад світаннем ушанаваць памяць продкаў, якія загінулі, зрабіўшы першы крок да Перамогі.

На гэты раз мерапрыемствы пачаліся не ў чатыры раніцы, а ў дзве гадзіны. Рэканструктары паказалі прысутным эпізоды апошняга мірнага вечара ў цытадэлі. На плошчы сабраліся ветэраны, кіраўнікі горада і вобласці, удзельнікі маштабнай рэканструкцыі падзей першага дня вайны, сотні гараджан. Сярод ветэранаў быў Пётр Паўлавіч КАЦЕЛЬНІКАЎ, выхаванец узвода музыкантаў, які 12-гадовым хлопчыкам сустрэў той страшны дзень.

— Апошнія гады я жыву ў Мінску ў дзяцей, але на гэтае мерапрыемства не мог не прыехаць, — сказаў Пётр Паўлавіч. — Успаміны аб вайне будуць са мной да апошняга майго дня.

...Як заўсёды, былі шчымліва ціхімі апошнія гадзіны перад світаннем, калі яшчэ не пяюць птушкі, і нават чуваць, як цячэ вада ў Бугу. Як заўсёды, паплылі па Бугу жалобныя вянкі, якія спусцілі на ваду вайскоўцы. Як заўсёды, прайшлі па плошчы Цырыманіялаў жанчыны ў белым адзенні са свечкамі ў руках. Мітынг-рэквіем пачаўся па традыцыі а чацвёртай гадзіне раніцы. Яго адкрыў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС:

— Мы смуткуем аб мільёнах воінаў, чые жыцці абарвалі варожыя кулі. Мы смуткуем аб сотнях тысяч дзяцей, жанчын, старых, якія загінулі ў канцэнтрацыйных лагерах і памерлі ад голаду. Мы смуткуем аб тых, хто на сваіх плячах вынес перамогу, але пазней памёр ад ран і хвароб. Памяць пра іх, а таксама пра герояў, якія здабылі перамогу, з'яўляецца ўсенароднай, не мае нацыянальнасцяў і межаў, — падкрэсліў губернатар.

Святейшы Патрыярх Кірыл, які да мітынгу адслужыў памінальную літыю ў Мікалаеўскім гарнізонным храме Брэсцкай крэпасці, прыняў удзел у жалобных мерапрыемствах.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

У музеі крэпасці.

Яшчэ раней, у Мінску, прадстаяцель заўважыў, што Брэсцкая крэпасць — месца асаблівае для яго сям'і. Тут загінуў яго родны дзядзька. А на мітынгу ён сказаў:

— Мы з вамі адзіная сям'я. І не толькі таму, што ў нас цячэ кроў, якая ўзыходзіць да нашых продкаў, але і таму, што мы пражылі адну гісторыю і радасці, і смутку. Як падзяліць гэту гісторыю? Як падзяліць крэпасць Брэсцкую? Ёсць рэчы непадзельныя, як непадзельная ў ідэале чалавечая сям'я. Гераічная абарона Брэсцкай крэпасці з'яўляецца для нас сімвалам адзінства, вобразам адзінства, здольнасці сумесна пераадольваць смяротную небяспеку і перамагаць.

На памяць аб сваім наведванні крэпасці Святейшы Патрыярх перадаў мемарыяльнаму комплексу абраз Божай Маці «Усіх смуткуючых Радасць». А пасля цырымоніі ўладыка наведаў музей Брэсцкай крэпасці-героя, азнаёміўся з экспазіцыяй, пакінуў запіс у Кнізе ганаровых гасцей.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

СЛАВЯНСКІЯ СЛОВЫ — «МІНСК» І «МІР»

Будаўніцтва шматфункцыянальнага цэнтра «Мінск-Мір» павінна стаць узорам супрацоўніцтва славянскага свету. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з саўладальнікам міжнароднай камерцыйнай кампаніі «Браты Карыч» Багалюбам Карычам і дэпутатам Народнай Скупшчыны (парламента) Сербіі, ганаровым консулам Беларусі ў Бялградзе Драгамірам Карычам, паведамляе БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што, паводле існуючай у яго інфармацыі, кампанія паспяхова вядзе свой бізнес у Беларусі. «Не тое што вялікіх, наогул праблем там няма. У вас праекты ідуць. Усё абяцанае вы робіце», — сказаў ён. У той жа час праекту па будаўніцтве цэнтра «Мінск-Мір» надаецца асаблівае значэнне. «Мы праваліць яго ўжо не маем ніякага права, і перш за ўсё вы. Я вельмі спадзяюся, што гэта будзе сур'ёзны праект», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Будзе вельмі добра, калі да гэтага праекта будуць далучаны ўсе рэспублікі, якія некалі ўваходзілі ў Югаславію. Я гэта толькі вітаць буду», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Праект «Мінск-Мір» абяцае стаць гістарычным, таму ні ў якім разе нельга застопарыць яго рэалізацыю, адзначыў Прэзідэнт. Беларускі бок, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, прыкладзе максімум намаганняў у выпадку ўзнікнення неабходнасці ўстараніць незразумелыя тармажэнні, падключыць дадатковыя сілы. «Мы павінны рэалізаваць яго годна. Няхай гэта будзе ўзорам супрацоўніцтва ўсяго нашага славянскага свету», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

Багалюб Карыч у час сустрэчы нагадаў аб ідэі пабудаваць на тэрыторыі «Мінск-Міра» міжнародны фінансавы цэнтр. Сербскі бізнесмен выказаў упэўненасць, што яе ўдасца рэалізаваць дзякуючы выгаднай пазіцыі Беларусі сярод краін ЕС і Еўразійскага эканамічнага саюза.

НА РАЗВІЦЦЁ СУПРАЦОЎНІЦТВА

з Афганістанам у гандлёва-эканамічным плане настроена наша краіна

Аб гэтым заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са спецыяльным прадстаўніком прэзідэнта Афганістана па супрацоўніцтве з краінамі СНД Махамадам Шакерам Каргарам, паведамляе БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што нядаўна адбылася яго тэлефонная размова з прэзідэнтам Афганістана. «Ён выказаў шэраг пажаданняў, я таксама прапанаваў яму шэраг напрамкаў нашага супрацоўніцтва. Ведаю, што Афганістан мае патрэбу сёння ў пэўнай эканамічнай, ваенна-палітычнай падтрымцы ў выніку тых працэсаў, якія там адбываюцца», — адзначыў беларускі лідар.

Беларускі бок разлічвае, што сустрэча са спецпрадстаўніком прэзідэнта Афганістана стане зыходным пунктам супрацоўніцтва па шэрагу пытанняў. У Беларусі, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, разлічваюць, што гэта стане пралогам да шэрагу «канкрэтных рухаў насустрач адзін аднаму па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве».

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі і ўсе ў рэгіёне на ўсходзе ад яе аддаюць належнае Афганістану за барацьбу, якую вядзе гэта краіна супраць сусветнага тэрарыстычнага руху.

АДКРЫТЫЯ ВАРОТЫ ПАМЯЦІ

22 чэрвеня для нашай краіны — не толькі дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, як напісана ў календарах. Гэта, без перабольшвання, дзень агульнага смутку. Мінула ўжо семдзесят чатыры гады, выраслі два пакаленні людзей, якія не ведаюць, што такое вайна, а 22 чэрвеня ў нас і сёння на вуліцах цішэй, чым звычайна, і ў людзей на тварах, здаецца, больш сур'ёзнасці і менш усмешак.

Штогод 22 чэрвеня на досвітку Брэсцкая крэпасць прачынаецца ад гукаў сірэны і выбухаў. Кожны, хто бываў там чэрвеньскай раніцай, ведае: адчуванні настолькі рэальныя, што яшчэ доўга не можаш прыйсці ў прытомнасць. Але людзі ідуць за гэтымі адчуваннямі, бо не дазваляюць сабе не тое што забыцца — нават прыглушыць памяць аб тых страшных днях, калі для Беларусі і яе народа пачалася барацьба за выжыванне. Сёлета, напрыклад, на памятных мерапрыемствах у гераічнай крэпасці прысутнічала каля 15 тысяч чалавек.

На працягу ўчарашняга дня па ўсёй краіне на мемарыялах праходзілі мітынгі памяці. І як заключны, самы моцны, акорд — мітынг-рэквіем «Вароты памяці», прысвечаны адкрыццю мемарыяльнага комплексу «Трасцянец». Ён пачаўся познім чэрвеньскім змярканнем там, дзе падчас вайны фашысты наладзілі сапраўдны канвеер па знішчэнні людзей з усёй Еўропы — па афіцыйных звестках, у «Трасцянцы» загінула больш за 200 тысяч чалавек, па іншых даных — больш за 500 тысяч. Удзел у мерапрыемстве прыняў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, а таксама ветэраны, прадстаўнікі дыпламатычнага корпусу, грамадскасці.

Яшчэ адны Вароты Памяці, якія на гэтай зямлі заўсёды будуць трымаць адкрытымі...

■ «Прамая лінія»

Аляксандр АЦЯСАЎ:

«Надзвычайных праблем няма»

У мінулую суботу падчас прамой тэлефоннай лініі праблемы жыхароў Прыдзвінскага краю выслухаў старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр АЦЯСАЎ. Многія з пытанняў, якія агучылі людзі, былі тыповымі для ўсёй краіны.

На «прамой лініі» — Аляксандр АЦЯСАЎ (злева).

Напрыклад, не ўсе зразумелі, навошта Беларусь перайшла на лічбавае тэлевяшчанне. 76-гадовая пенсіянерка паскардзілася на тое, што на яе дачы тэлевізар не прымае каналы... Маўляў, чаму ж ніхто не папярэдзіў, што адключаць ранейшае вяшчанне. Бабулька шчыра хвалявалася і з-за таго, ці будзе тэлевізар «лавіць» каналы ў гарадской кватэры. Аляксандр Ягоравіч растлумачыў, што адпаведная інфармацыя аб пераходзе на «лічбу» даўно і пастаянна перадавалася ў «бягучым радку» ў эфіры тэлеканалаў. І ў друкаваных СМІ шмат пісалі па тэме з падрабязным тлумачэннем усіх нюансаў. Пераход на лічбавы фармат вяшчання зрабілі ва ўсім цывілізаваным свеце, і Беларусь не горшая. Пры гэтым Віцебшчына, згодна з адпаведным графікам, апошняй у рэспубліцы спыніла трансляцыю эфіру ў аналагавым фармаце. Жанчыне таксама растлумачылі, што прыстаўка да тэлевізара каштуе нядорага... Аляксандр Ацясаў паабяцаў асабіста паспрыяць пенсіянерцы ў «пераходзе на лічбу». А ў гарадской кватэры, калі тэлевізар падключаны да кабельнага тэлебачання, усе каналы можна глядзець без дадатковых прыстасаванняў, супакоілі заяўніцу.

Падчас «прамых ліній» па традыцыі людзі задаюць пытанні па тэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Не выключэннем стала і чарговая. Жыхарка з гарадскога пасёлка Обаль Шумілінскага раёна звярнула ўвагу на дрэнную якасць вады. Адзначыла, што звярталася да адказных асоб раённага ўзроўню, але ж выніку няма. А жыхарка абласнога цэнтра паскардзілася, што яе кватэру залівае падчас дажджоў. Знаходзіцца яе жыллё на 2-м паверсе старога 5-павярховага дома на Маскоўскім праспекце. Заяўніца, дарэчы, падкрэсліла, што вада цячэ па ўсіх паверхах. А жыхарка Полацка ніяк не можа зразумець, чаму лямпачкі ў ліхтары, які асвятляе прыпынак, часта перагараюць. Напэўна, праблема ў праводцы?

Вельмі эмацыйным быў зварот жанчыны, якая сказала, што з'яўляецца фактычна бяздомнай, а жыццё яе ператварылася ў замкнёнае кола.

— З-за таго, што няма рэгістрацыі па месцы жыхарства, не бяруць на працу. Дзіця ў школе адмовіліся перавесці ў 5 клас, бо зноў жа рэгістрацыі няма. А ў мяне двое непаўналетніх. Як зарэгістравацца і дзе прапісацца?

Старшыня абласнога Савета прапанаваў ёй, бадай, самы аптымальны варыянт: можна перасяліцца ў сельскую мясцовасць. Там заўсёды не хапае рабочых рук, ды і жыллём забяспечваюць. І, вядома ж, школы ў глыбінцы ёсць. Вось і вырашэнне праблем... Пасля роздумаў і ўдакладненняў суразмоўца пагадзілася. Але падкрэсліла, што Віцебск яе ўсё ж больш задаволіў бы, бо па прафесіі яна гандлёвы работнік. Аляксандр Ацясаў паабяцаў пагаварыць з кіраўніком спажывецкай кааперацыі найбліжэйшага да Віцебска Гарадоцкага раёна: можа, і ў самім райцэнтры жанчыне ўдасца ўладкавацца на працу. Гарадок пасля таго, як там летась правялі абласныя «Дажынкі», стаў вельмі ўтульным, ды і ва ўсім раёне многа чаго зроблена, каб людзям было камфортна жыць. І ад Віцебска, які так падабаецца грамадзянцы, Гарадок недалёка — каля 30 кіламетраў, і з транспартам праблем няма.

Былі званкі і па пытаннях «ад зямлі». Жыхар Аршанскага раёна агучыў просьбу разабрацца, чаму яму, гаспадару, які здае дзяржаве малако, не даюць сена? А ў Лёзненскім раёне ў гаспадарцы касілку нельга ўзяць, каб нарыхтаваць корм для коз, паведаміў яшчэ адзін заяўнік.

— «Прамая лінія» — гэта самы даступны сродак зносін насельніцтва з уладай. Грамадзянам не трэба нікуды ездзіць, запісвацца на прыём. І так кожны тыдзень: людзі па тэлефоне могуць выказаць сваю праблему. Для ўлады такія «лініі» — магчымасць зрабіць аналіз таго, што хвалюе людзей. Сёння пасля зваротаў, якія пачуў, магу канстатаваць: у прынцыпе, улада на месцах працуе: сярод агучаных пытанняў і праблем не было надзвычайных... Усе звароты будуць вывучаны, — сказаў карэспандэнту «Звязды» Аляксандр Ацясаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

■ Будзь у курсе

Дадатковыя ў Александрыю на свята

Беларуская чыгунка прызначыла на 4-5 ліпеня дадатковыя цягнікі рэгіянальных ліній эканом-класа для перавозкі ўдзельнікаў і гасцей свята Купалле («Александрыя збірае сяброў»), які пройдзе ў вёсцы Александрыя Шклоўскага раёна.

Дадатковыя цягнікі будуць курсіраваць па маршруце Магілёў — Шклоў — Копысь (в. Александрыя) — Шклоў — Магілёў і Орша — Копысь — Орша. На 4 ліпеня на ўчастку Магілёў — Шклоў — Копысь (в. Александрыя) — Шклоў — Магілёў прызначаны цягнік №6622, які адправіцца з Магілёва ў 16.00 і прыбудзе на станцыю Копысь у 16.50. 5 ліпеня будзе курсіраваць дадатковы цягнік №6723, які адправіцца з Копысі ў 0.10 і прыбудзе ў Магілёў у 1.06, і дадатковы цягнік №6725. Ён пойдзе з Копысі ў 3.30 і будзе ў Магілёве ў 4.26. Па маршруце Орша — Копысь (в. Александрыя) на 4 ліпеня прызначаны дадатковы цягнік рэгіянальных ліній эканом-класа №6721 (час адпраўлення з Оршы ў 12.50, прыбыцця ў Копысь — у 13.24). А 5 ліпеня ў раскладзе будуць дадатковыя цягнікі №6724 (час адпраўлення з Копысі ў 0.52, прыбыцця ў Оршу ў 1.24) і №6726 (час адпраўлення з Копысі ў 4.25, прыбыцця ў Оршу ў 4.58). Пасажыры таксама могуць даехаць на свята ў Александрыю цягнікамі рэгіянальных ліній эканом-класа, якія ідуць па графіку.

Сяргей РАСОЛЬКА.
sr@zviazda.by

ПРАЗ СТАГОДДЗІ — ДА СУЧАСНАСЦІ

Райцэнтр Карма, што на поўначы Гомельшчыны, адзначыў 450-годдзе. Да свята прымеркавалі адкрыццё цалкам адноўленага фантана на вуліцы Леніна...

Грошы, зароблены жыхарамі Кармы падчас суботніка, дазволілі зрабіць такі падарунак населенаму пункту. Месца гэтае добраўпарадкавалі — зрабілі вакол прыгожыя дарожкі. І адразу ж правялі прэзентацыю кніг пра Карму.

Гэта цяпер на Кармяншчыне налічваецца 68 населеных пунктаў, у якіх пражывае амаль 17 тысяч чалавек. А калісьці, сцвярджаюць археолагі, у пасляледавіковы перыяд на Пасожжы жылі плямёны, якія стварылі так званую Грэнскую культуру. Менавіта ў гэтых мясцінах, недалёка ад вёскі Ворнаўка, ва ўрочышчы Грэнск у 1926 годзе савецкім археолагам Палікарповічам былі знойдзены сезонныя стаянкі старажытных паляўнічых. Да таго ж, ля вёскі Струмень у Карабельным возеры знойдзены рэшткі старажытнага карабля.

Ёсць версія, што ў сярэдзіне XV стагоддзя славуты Апанас Нікіцін, калі хадзіў за тры моры, спыняўся ў Карме на заезным двары. Вядома, што праз гэтыя мясціны ў 1780 годзе праязджала расійская імператрыца Кацярына II. Акрамя таго, каля стагоддзя таму ў гэтым раёне жыў і працаваў выдатны чалавек — унікальны педагог Панцеляймон Лепяшынскі. Ён у вёсцы Літвінавічы заснаваў школу-камуну, дзе дзяцей вучылі рабочым прафесіям і пісьму.

У гэтыя выхадныя ў гонар юбілею гарадскога пасёлка Карма ў новым Мікольскім храме быў адслужаны спецыяльны малебен. Афіцыйныя мерапрыемствы адкрыліся ўскладаннем кветак да помніка воінам-вызваліцелям. Ну а потым жыхары населенага пункта, дзе сёння жыве 7,5 тысячы насельніцтва, прынялі ўдзел у вялікай культурнай праграме. Знайшлося месца дзіцячым атракцыёнам, выставе мастакоў раёна, фотавыстаўцы, выязному гандлю, музейнай экспазіцыі, файер-шоу, флэш-мобу «Люблю цябе, Карма!»...

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
astashkevich@zviazda.by

■ Энергетычная бяспека

БЕЛАЭС: БУДАЎНІЦТВА БЕЗ КРЫТЫЧНЫХ ЗАЎВАГ

Ніякіх сістэмных недапрацовак падчас комплексных праверак не выяўлена

Менавіта так была ацэнена агульная сітуацыя на галоўнай будпляцоўцы краіны начальнікам Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі (Дзяржатамнагляда) Вольгай ЛУГАЎСКОЙ. Пра гэта яна паведаміла на брыфінгу «Ядзерная і радыяцыйная бяспека ў Беларусі: міжнародная і ўнутрыкраінавая ацэнка» ў прэс-цэнтры БЕЛТА.

Цяпер на гэтым аб'екце дзейнічае рэжым пастаяннага нагляду, калі спецыялісты дэпартамента правяраюць выкананне тых патрабаванняў, якія былі прад'яўленыя па выніках папярэдніх інспекцый. Вольга Лугаўская адзначыла, што станцыя выконвае ўсе патрабаванні ў адпаведнасці з вызначанымі тэрмінамі, таму крытычных заўваг па якасці ўзвядзення аб'екта ўвогуле ўзнікаць не павінна.

НЕДАХОПЫ ВЫПРАЎЛЯЮЦЦА Ў РЭЖЫМЕ АНЛАЙН

Паводле слоў Вольгі Лугаўской, на будпляцоўцы БелАЭС працуе вялікая колькасць арганізацый, таму ёсць шэраг пытанняў, якія не тычацца кампетэнцыі Дзяржатамнагляда. Тут узнікаюць заўвагі агульнага будаўнічага характару, напрыклад, тыя, што тычацца падрыхтоўкі дакументаў. Пры гэтым усе яны не носяць сістэмны характар. Пасля кожнай праверкі рыхтуецца акт, які дасылаецца ў эксплуатуючую арганізацыю. «Разам з тым, стаўленне да заўваг тут сапраўды сур'ёзнае, бо частка з іх выпраўляецца адразу падчас праверкі», — удакладніла кіраўнік дэпартамента.

НАСТУПНАЯ ПРАВЕРКА АДБУДЗЕЦЦА Ў КАСТРЫЧНІКУ

Першая комплексная праверка забеспячэння бяспекі пры ўзвядзенні першага і другога энергаблокаў Беларускай АЭС праводзілася з 12 па 29 мая. Кіраваў праверкай першы намеснік начальніка Дзяржатамнагляда Леанід Рыдлеўскі, у ёй удзельнічалі падраздзяленні МНС, Дзяржстандарт, Міністэрства аховы здароўя, Мінпрыроды, Мінэнерга, МУС, Мінпрацы і сацабароны. У якасці кансультантаў у комплекснай праверцы прымалі ўдзел расійскія спецыялісты — супрацоўнікі федэральнага прадпрыемства «Бяспека».

Пасля гэтай маштабнай праверкі Дзяржатамнаглядам падрыхтаваны і прадстаўлены акт праверкі і прадпісанне, выкананне якога будзе строга адсочвацца. А вось другая такая праверка БелАЭС запланавана сёлета на кастрычнік. Цяпер спецыялісты дэпартамента рыхтуюць адпаведны пералік пытанняў. Тут Вольга Лугаўская падкрэсліла, што ў працоўным парадку гэты пералік будзе яшчэ карэктавацца. «Сёлета з лютага ўсе наглядныя органы працуюць па новым распарадку. Мы ажыццяўляем рэжым пастаяннай прысутнасці на пляцоўцы, калі інспектары Дзяржатамнагляда, па сутнасці, кожны дзень выходзяць на працу на пляцоўку будаўніцтва», — патлумачыла спецыяліст.

ЗА АБСТАЛЯВАННЕМ — ДВАЙНЫ КАНТРОЛЬ

Дзяржатамнагляд адзначае поўнае выкананне патрабаванняў да захоўвання абсталявання для Беларускай АЭС. Такую ацэнку станцыі пасля праверкі даў **начальнік упраўлення ацэнкі бяспекі сістэм і абсталявання ядзерных установак Дзяржатамнагляда Сяргей ЗАЙЦАЎ**.

Спецыяліст нагадаў, што падчас комплекснай праверкі будаўніцтва БелАЭС у маі правяраліся ў тым ліку ўмовы захоўвання абсталявання. «Што тычыцца захоўвання, то хачу адзначыць, што ангары, якія для гэтага пабудаваны, сапраўды чыстыя і сухія, абсталяванне захоўваецца ў вельмі добрых умовах, — адзначыў Сяргей Зайцаў. — Патрабаванні да захоўвання абсталявання БелАЭС выконваюцца, доступ да яго абмежаваны, ніякіх заўваг па гэтым пытанні не было».

Эксперт Дзяржатамнагляда паведаміў, што вытворчасць абсталявання для Беларускай АЭС знаходзіцца на пастаянным кантролі. У працэсе яго перадачы ад вытворцы эксплуатуючай арганізацыі наладжаны двайны кантроль якасці — спачатку на прадпрыемстве і непасрэдна пры паступленні на атамную станцыю. «На заводзе на этапе прыёмкі абсталявання правяраецца ўся дакументацыя на працягу некалькіх дзён ці тыдняў. На асаблівым кантролі — акты праверак і акты выпрабаванняў абсталявання», — расказвае Сяргей Зайцаў. Пасля гэтага абсталяванне дастаўляецца на пляцоўку БелАЭС, дзе яно праходзіць такі ж пільны кантроль. Такім чынам, кантрольныя мерапрыемствы праводзяцца і пасля транспарціроўкі. Гэта дазваляе не дапусціць дэфармацыі абсталявання ці страты дакументаў. У працэсе мантажу і наладкі абсталявання таксама кантралюецца адпаведнасць яго праектнай дакументацыі.

РАДЫЕАКТЫЎНЫЯ АДХОДЫ ЗАСТАНУЦЦА НА СТАНЦЫІ КАЛЯ 10 ГАДОЎ

Намеснік начальніка Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС Рыгор АСТАШКА нагадаў, што ўрад нядаўна зацвердзіў стратэгію абыходжання з радыеактыўнымі адходамі БелАЭС. У адпаведнасці з ёй, радыеактыўныя адходы (РАА) будуць захоўвацца на станцыі толькі на працягу пэўнага перыяду. Гэты працэс абмяжоўваецца 10 гадамі, пасля чаго неабходна будзе вырашаць пытанне будаўніцтва пункта пахавання РАА.

Вырашэнне пытання абыходжання з радыеактыўнымі адходамі Беларускай АЭС разглядаецца ў межах агульнай ліцэнзіі на будаўніцтва атамнай электрастанцыі, і гэта ўжо зроблена. «Што тычыцца ўзвядзення пункта пахавання адходаў і іншых пытанняў, звязаных з гэтай тэмай, то такая работа ў нас яшчэ наперадзе», — удакладніў сітуацыю Рыгор Асташка.

У сваю чаргу начальнік Дзяржатамнагляда Вольга Лугаўская дадала, што ліцэнзаванне — працэс досыць працяглы, працаёмкі і навукаёмісты. Для выканання экспертызы бяспекі арганізацыя (патэнцыйны ліцэнзіят) падае ў адпаведны орган цэлы камплект дакументаў — так званую справаздачу па абгрунтаванні бяспекі. Такая справаздача змяшчае ў тым ліку спецыяльныя раздзелы, якія тычацца пытанняў радыеактыўных адходаў, якія ўтвараюцца на АЭС.

Такім чынам, у якасці адной з умоў выдачы такой ліцэнзіі вызначаны абавязак БелАЭС прадаставіць Дзяржатамнагляду інфармацыю аб класіфікацыі РАА, іх колькасці і стратэгіі абыходжання з імі. Цяпер наша станцыя атрымала поўную ліцэнзію на будаўніцтва двух энергаблокаў. Для атрымання наступнай ліцэнзіі неабходна падрыхтаваць удакладнены варыянт справаздачы па абгрунтаванні бяспекі. «Пры ліцэнзаванні падобнага аб'екта ўсе пытанні, звязаныя з радыеактыўнымі адходамі, вывучаюцца ў поўным аб'ёме», — лічыць Вольга Лугаўская.

Увогуле, стратэгія абыходжання з радыеактыўнымі адходамі Беларускай атамнай электрастанцыі распрацавана з улікам прынцыпаў абыходжання з радыеактыўнымі адходамі, якія рэкамендаваны Міжнародным агенцтвам па атамнай энергіі (МАГАТЭ). У дакументе прадугледжваецца забеспячэнне прымальнага ўзроўню абароненасці персаналу АЭС, насельніцтва і навакольнага асяроддзя ад радыяцыйнага ўздзеяння, дзе асаблівая ўвага будзе засяроджана на прадухіленні аварый з радыяцыйнымі наступствамі.

Рэалізацыя стратэгіі абыходжання з радыеактыўнымі адходамі БелАЭС будзе садзейнічаць удасканаленню сістэмы абыходжання з адходамі такога тыпу, мінімізацыі іх узнікнення ў працэсе эксплуатацыі атамнай электрастанцыі, а таксама зніжэнню эксплуатацыйных выдаткаў на

Даведка «Звязды»

Пяты Нацыянальны даклад быў падрыхтаваны ў 2014 годзе. Ён афіцыйна прадстаўлены ў МАГАТЭ, размешчаны на сайце гэтай арганізацыі і Дзяржатамнагляда. Даклад змяшчае пералік установак, на якіх адбываецца абыходжанне з адпрацаваным палівам і радыеактыўнымі адходамі ў Беларусі, звесткі аб дзяржаўнай палітыцы і практыцы ў гэтай сферы, заканадаўстве, выкананні рэкамендацый па выніках разгляду папярэдняга дакладу і іншую інфармацыю. У дакументе ёсць інфармацыя аб падзеях 2012-2014 гадоў. Распрацоўшчыкам дакумента выступіў Дзяржатамнагляд у супрацоўніцтве з іншымі зацікаўленымі органамі дзяржкіравання.

абслугоўванне такой сістэмы. У будучыні стратэгія павінна спрыяць памяншэнню фінансавай нагрузкі, якая звязана з неабходнасцю падтрымання бяспекі аб'ектаў сістэмы абыходжання з радыеактыўнымі адходамі для наступных пакаленняў.

НАШ ДАКЛАД ПАЧУЛІ І СТАНОЎЧА АЦАНІЛІ

Рыгор Асташка паведаміў, што абарона 5-га Нацыянальнага дакладу Беларусі аб выкананні Аб'яднанай канвенцыі аб бяспецы абыходжання з адпрацаваным палівам і аб бяспецы абыходжання з радыеактыўнымі адходамі адбылася на нарадзе ў штаб-кватэры МАГАТЭ ў Вене. Тады былі прызначаны міжнародныя эксперты, якія праводзілі гэтую нараду. Іх задачай было сабраць усе пытанні і ўсю інфармацыю, якая агучвалася, аналізавалася і абмяркоўвалася, і зрабіць свае высновы. «Справаздача, што была падрыхтавана па сітуацыі ў Беларусі, мае пазітыўнае адценне», — адзначыў спецыяліст.

Ён падкрэсліў, што нацыянальны даклад Беларусі выклікаў вялікую цікавасць. На беларускай прэзентацыі прысутнічаў намеснік генеральнага дырэктара МАГАТЭ Дзяніс Флоры. Паводле вызначанай МАГАТЭ працэдуры, у ходзе падрыхтоўкі да нарады ў прадстаўнікоў іншых краін была магчымасць у аддаленым рэжыме задаць пытанні па беларускім дакладзе, адначасова беларускія спецыялісты маглі задаваць пытанні па нацыянальных дакладах іншых краін. Усяго ў аддаленым рэжыме па беларускім дакладзе паступіла 69 пытанняў. Найбольшую цікавасць да дакумента праявілі Германія, Літва, ЗША, Украіна, Францыя і ПАР.

У прыватнасці, з боку Літвы паступіла 14 пытанняў. «Абмеркаванне ў фармаце ўзаемадзеяння Беларусь—Літва праходзіла вельмі канструктыўна, і мы таксама мелі магчымасць у ходзе дакладу Літвы задаць пытанні», — сказаў Рыгор Асташка. Увогуле, пытанні па беларускім дакладзе тычыліся заканадаўчай інфраструктуры, дзейнасці спецпрадпрыемства «Экарэс», сістэмы абыходжання з адходамі чарнобыльскага паходжання, павышэння бяспекі пунктаў захоўвання радыеактыўных адходаў у месцах дыслакацыі вайсковых часцей СССР, а таксама стратэгіі абыходжання з адходамі Беларускай АЭС. На кожны з іх былі дадзены грунтоўныя адказы. Асаблівая цікавасць была праяўлена да парадку абыходжання з адпрацаваным ядзерным палівам на Беларускай АЭС, у тым ліку яго магчымае вяртанне.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

■ Фінансавыя інавацыі

КАШТОЎНЫЯ ПАПЕРЫ СТАЛІ ВІРТУАЛЬНЫМІ

Цяпер дзяржаўныя валютныя аблігацыі прапануюцца насельніцтву і ў бездакументарнай форме

Размяшчэнне дэбютнага выпуску такіх каштоўных папер для фізічных асоб аб'яўлена Міністэрствам фінансаў сёлета з 22 чэрвеня па 31 снежня. Гэта цалкам новы фінансавы прадукт, калі грамадзянам прапануюць дзяржаўныя валютныя аблігацыі ў выглядзе запісаў па рахунках «дэпо».

Прэс-служба Мінфіна паведамляе, што стартавы выпуск такіх аблігацый гэтым летам будзе мець аб'ём 50 млн долараў. Віртуальныя аблігацыі прапануюцца насельніцтву пад 7% гадавых тэрмінам на 1 год. Продаж валютных аблігацый названага выпуску будзе ажыццяўляцца да канца гэтага года шляхам размяшчэння на пляцоўцы акцыянернага таварыства «Беларуская валютна-фондавая біржа». Набыць бездакументарныя аблігацыі можна праз 11 банкаў краіны. Сёння сярод фінансавых устаноў, якія пацвердзілі гатоўнасць аказваць паслугі фізічным асобам па аперацыях з дзяржаўнымі валютнымі аблігацыямі ў бездакументарнай форме, ёсць тры найбуйнейшыя банкі — Беларусбанк, Белагрmaprамбанк і Белінвестбанк, аднак ёсць тут і невялікія прыватныя банкі (Тэхнабанк і Альфа-Банк).

ПРАПАНОВА — ДЛЯ ЗАБЯСПЕЧАНЫХ

Раней першыя дзяржаўныя доўгатэрміновыя аблігацыі з працэнтным даходам былі прапанаваны насельніцтву менавіта ў выглядзе каштоўных папер на папяровым носьбіце. Тады магчыма было набыць падобныя паперы коштам за 200, 1000 і 5000 долараў. Валютныя аблігацыі даваліся на прад'яўніка, а банкі не патрабавалі ад кліентаў ніякіх дакументаў. Сёння дзяржаўныя аблігацыі, намінаваныя ў замежнай валюце, прапануюцца не для бедных, бо намінальная цана адной такой каштоўнай паперы складае 5 тысяч долараў. Згодна з умовамі выпуску, тэрмін абарачэння аблігацый складае 368 дзён, а датай іх пагашэння з'яўляецца 24 чэрвеня 2016 года.

УЛАДАЛЬНІК АБЛІГАЦЫІ — КЛІЕНТ З ПАШПАРТАМ

На сваім сайце Мінфін размясціў адпаведныя рэкамендацыі наконт алгарытму набыцця такіх аблігацый. Пакупніком гэтых каштоўных папер можа быць грамадзянін нашай дзяржавы, а таксама і нерэзідэнт Беларусі. Галоўнае — мець валютныя сродкі і выканаць адпаведны механізм працэдур.

Па-першае, кліенту неабходна заключыць з банкам дагавор на адкрыццё рахунку «дэпо» (для ўліку, захоўвання і ажыццяўлення аперацый з дзяржаўнымі аблігацыямі). Потым разам з пашпартам і адпаведнай анкетай адкрыць такі рахунак. На другім этапе неабходна заключыць з банкам дагавор на адкрыццё бягучых (разліковых) банкаўскіх рахункаў і адкрыць іх. Рахунак у замежнай валюце патрэбен для набыцця дзяржаўных аблігацый, атрымання выплат па іх працэнтнага даходу, наміналу аблігацыі пры яе пагашэнні, а рахунак у беларускіх рублях — для выплаты камісій і ўзнагароджанняў банку, іншых плацяжоў. Таксама кліент павінен заключыць з банкам дагавор камісіі для набыцця дзяржаўных аблігацый у сістэме ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа» праз здзелку куплі-продажу.

КУПЛЯЦЬ ВАРТА ЗА ЛЕГАЛЬНЫЯ ГРОШЫ

Для атрымання прафесійнага каментарыя наконт нюансаў набыцця гэтых аблігацый рэдакцыя звярнулася да спецыялістаў плацежнай сістэмы «БелКарт». У прэс-службе сістэмы нам паведамілі, што банкі не будуць патрабаваць у сваіх кліентаў дэкларацыю аб паходжанні грошай, аднак інфармацыя аб здзелцы з валютнымі аблігацыямі будзе накіравана ў падатковую інспекцыю. Не, даход, які атрымае фізічная асоба ад валютнай аблігацыі, падаткам не абкладаецца. Проста падатковая інспекцыя можа спытаць у чалавека, дзе ён узяў такія грошы.

ДЗЯРЖАВА АБЯЦАЕ

Даход па бездакументарных аблігацыях выплочваецца кліенту за чатыры разы. Па першым працэнтным перыядзе — сёлета 24 верасня, па другім — 24 снежня, па трэцім — 24 сакавіка 2016 года, а па чацвёртым, канчатковым, — 24 чэрвеня наступнага года. Асобна ў паведамленні прэс-службы гаворыцца, што дзяржаўныя валютныя аблігацыі з'яўляюцца высокапрыбытковым і выключна надзейным фінансавым інструментам, бо абавязацельствы па пагашэнні аблігацый і выплаце даходу па іх забяспечаны сродкамі рэспубліканскага бюджэту і іншай маёмасцю, што знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці. Гэтыя плацяжы з'яўляюцца першачарговымі ў адносінах да іншых расходаў з рэспубліканскага бюджэту. Зразумела, што ў будучых пакупнікоў гэтых аблігацый узнікаюць пытанні аб памеры пэўных камісій і іншых узнагароджанняў банкам. Пра гэта мы раскажам ужо ў наступных нумарах газеты.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

■ Дары лесу

ЧЭРВЕНЬСКІЯ ЧАРНІЦЫ САСПЕЛІ

Днямі, вяртаючыся з камандзіроўкі па трасе Дамачава — Брэст, фактычна з самага поўдня Брэсцкай вобласці, убачыла, што прадаюць чарніцы. Недалёка ад павароту на Белае возера і вядомы санаторый «Бярэсце» стаіць сімпатычная стрэшка са сталамі, за якімі чакаюць пакупнікоў «чарнічныя» зборшчыкі.

Жанчыны з суседніх вёсак гандлююць першым ураджаем чорных ягад. І трэба сказаць, ягады яны збіраць умеюць: чарніцы чыстыя, нібы перабраныя; ні лісточка, ні ігліцы ў вядзерцы. Дома перамывала куплены слоік лясных дароў — ніводнай смяцінкі не знайшла. Ягады смачныя, не кіслыя і вельмі моцныя, хоць і не надта буйныя.

Ніна Карпаўна Шавека *(на здымку справа)* з Дамачава сказала, што ўжо некалькі гадоў мае добрую прыбаўку да пенсіі ад збору чарніц. Цяпер прынесла на продаж два маленькія вядзерцы, а калі сезон распачнецца поўнасцю, бывае, за дзень і 10-літровае вядро збірае, а то і два. Яе суседка па прылаўку Надзея Дарафееўна адзначыла, што гэта першыя ягады, цалкам увойдуць у сілу і нальюцца спеласцю чарніцы праз тыдзень-другі.

А пакуль нават спрактыкаваныя зборшчыцы не даюць дакладных прагнозаў на ўраджай гэтага года. Трэба пачакаць, кажуць яны, тады стане канчаткова ясна.

Машыны актыўна спыняюцца каля гэтага навеса. Паўлітровы слоік чарніц каштуе 25 тысяч рублёў, літровы — 50. Бяруць у асноўным не больш за літр. Ніна Карпаўна гаворыць, што першыя ягады вельмі каштоўныя як крыніца вітамінаў, і для зроку карысныя, і для ўсяго арганізма. Іх трэба есці свежымі. А вось нарыхтоўваць на зіму ў выглядзе варэння ці замарожваць мэтазгодна праз тыдні два. Тады яны будуць найлепш захоўвацца.

Пацікавілася, хто пабудаваў навес і абсталяваў месца для гандлю. Аказалася, Брэсцкі лясгас. За гэта зборшчыкі вельмі ўдзячныя прадпрыемству. Узвялі гэтыя прылаўкі са стрэшкай гады чатыры таму, а летась падрамантавалі і абнавілі. Цяпер тут і зручна, і прыгожа. За сталамі стаялі шэсць жанчын і адзін прадстаўнік моцнага полу. Мужчына сказаў, што ён часова не працуе, але не нейкі там дармаед. Ён сумленна зарабляе на жыццё вельмі нялёгкай працай. Чарніцы сабраць — трэба спіну пагнуць. І з гэтым даводзіцца пагадзіцца.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота аўтара.
yackevich@zviazda.by

Брэсцкі раён.

■ Свая гаспадарка

ЯГАДНЫ БІЗНЕС

Пра гектары клубніц і мільёны рублёў за сезон

Для адных лета — чаканы адпачынак, для іншых, уладальнікаў лецішчаў і агародаў, — гарачая працоўная пара. Асабліва гарачыя дзянькі чакаюць фермераў Брэстчыны, для якіх уласная гаспадарка — найлепшая крыніца даходу. Чэрвень для іх — салодкі сезон: у гэтым месяцы спеюць клубніцы. Ці вялікі сёлета ўраджай, як ідзе нарыхтоўка і наколькі прыбытковы ягадны бізнес? Па адказы мы паехалі ў самыя клубнічныя мясціны — у Лунінецкі раён.

КОЛЬКІ СІЛ УКЛАДЗЕШ, СТОЛЬКІ І ВЫРАСЦЕ

Клубнічных «плантатараў» мы заўважылі яшчэ а шостай раніцы, калі пад'язджалі да Лунінца. Мясцовыя жыхары хуценька збіраюць салодкі ураджай, каб ужо ў сем-восем завезці яго на рынак (большасці ж пасля градак трэба паспець на асноўную працу). Хоць прадаць ягады можна і побач з домам: шматлікія машыны перакупшчыкаў стаяць уздоўж дарогі.

Па дарозе ў вёску Дварэц (менавіта тут вядзецца самы буйны клубнічны гандаль у краіне) спыняемся ля адной з раённых крам у Язвінках. Тут таксама прымаюць ураджай у насельніцтва. Па 2500 рублёў за кілаграм бяруць дробныя клубніцы для перапрацоўкі на пладова-ягадныя віны, па 4000 — ягады буйнейшыя (яны пойдуць на кансервы, дзіцячае харчаванне, джэмы). Кошты не самыя прывабныя, таму і здаюць няшмат (прадавец расказвае, як сама сёння зранку сабрала са свайго ўчастка два вядры і аддала праезджым скупшчыкам па 25 тысяч за кілаграм).

Набліжаемся да дварэцкага рынку. На гадзінніку — дзевяць раніцы, і гандаль у самым разгары. Падчас сезона штодзень сюды прыязджае каля 160 машын нарыхтоўшчыкаў, 150 тон ягад скупляецца за суткі. Зранку клубніцы набываюць беларусы, пасля абеду падцягваюцца расіяне. Кошт залежыць ад попыту.

— Некалькі дзён таму было мала пакупнікоў, добрыя ягады аддавалі па 7-14 тысяч за кілаграм, — успамінае **старшыня Дварэцкага сельвыканкама Аляксандр ВІДНІКЕВІЧ**, які вызваўся быць нашым гідам. — Сёння месцічам больш шанцуе, кілаграм ідзе ў сярэднім за 18-22 тысячы.

Прадаўцы прыбываюць адзін за адным. Толькі адчыняецца багажнік — збягаюцца скупшчыкі, тавар ацэньваюць.

— 25 тысяч за кілаграм! — называе свой кошт жанчына, якая прывезла клубніцы з вёскі Чырвоная Воля, што ў пяці кіламетрах адсюль.

Нарыхтоўшчыкі адмахваюцца: знойдзем таннейшыя. Урэшце хтосьці з аптавікоў згаджаецца забраць ягады па 23 тысячы за кіло. Пакуль клубніцы ўзважваюць (у 24 вёдрах аказалася амаль паўтара цэнтнера), размаўляем з задаволенай гаспадыняй. Сённяшні ўраджай Валянціна разам з сястрой сабрала за дзве з паловай гадзіны. Зямельны надзел, адведзены пад клубніцы, — 25 сотак. Але, па словах жанчыны, па мясцовых мерках гэта не так шмат: некаторыя і па гектары засаджваюць.

— І ці шмат грошай на гэтым можна зарабіць? — цікавімся мы.

— За сёння амаль на 3,5 мільёна прадалі, — падлічвае Валянціна. — Бывае, і пяць за дзень атрымліваем. За сезон тысячы тры долараў зарабіць можна. Сакрэты ўраджайнасці? Колькі сіл укладзеш, столькі і вырасце. Саджанцы ледзь не ўвесь год даглядаеш: праполваеш, падкормліваеш. За святло шмат плацім, бо электрычная калонка стаіць, паліваем грады з 4 да 12 раніцы.

Марыя Іванаўна з вёскі Дварэц прыцягнула на веласіпедзе тры вядры.

— Важу па трошачку. Старыя багата хіба здадуць? — усміхаецца яна.

— Вялікі сёлета ўраджай?

— Ай, спёка збіла, — войкае Марыя Іванаўна. — Клубніцы ладна, а вось бульба прапала.

Транспарт лунінецкіх фермераў — асобная гісторыя. Да звычайнага веласіпеда ці матацыкла знаходлівыя месцічы прымацоўваюць палкі, дошкі, кручкі. Пасля такога «цюнінгу» за адзін рэйс удаецца завезці ў тры разы больш вёдраў. Жыхар вёскі Цна Васіль Рыгоравіч дабраўся да рынку на самаробным трактары. Змайстраваў з фанеры і пластмасавых лістоў кабіну, прыладзіў прычэп — і зручны для паклажы і кароткіх маршрутаў транспарт гатовы!

— Суседзяў завёз, — кажа стары. — Заадно і свае ягады крыху здаў. Але ў мяне клубніцы дробныя, у бочку ўзялі.

Акрамя прыватных перакупшчыкаў, якія бяруць тавар для продажу ў Мінску, Магілёве, на рынак па клубніцы прыехалі і машыны раённых спажывецкіх таварыстваў.

— Ці шмат закупілі? — пытаемся ў супрацоўнікаў Лагойскага спажыўтаварыства.

— Крыху болей за тры тоны. У планах нарыхтаваць 10 тон: дзве — на продаж, восем — на прамысловую перапрацоўку (для Чэрвеньскага і Барысаўскага заводаў). За буйныя ягады прапануем 16 тысяч за кілаграм, за малыя — пяць. Вунь насупраць бяруць па чатыры, калі і мы такі кошт установім, марна прастаім дзень, людзі не здадуць. А набываць даражэй — не акупіцца. З улікам ПДВ, гандлёвай нацэнкі, транспартных расходаў клубніцы, якія мы бяром па 16 тысяч, у краме пойдуць за 22 тысячы. Заплацім за ягады столькі, колькі прыватныя перакупшчыкі, — трэба будзе прадаваць па 30 тысяч, для насельніцтва гэта дорага.

У кааператыва Лунінецкага раёна для нарыхтоўкі ўсё гатова: і тара, і машыны. Толькі б людзі здавалі! Але прыносяць слаба. **Дырэктар аптова-рознічнага аб'яднання Лунінецкага райспажыўтаварыства Ніна ВІЦЭНКА** канстатуе, што сёння яны маюць толькі 24 тоны:

— Летась мы нарыхтавалі 124 тоны. А былі гады, што і па 500, і па 700 тон набывалі. Гэта толькі наша аб'яднанне, а лічбы па кааператыве яшчэ вышэйшыя атрымліваліся. У нас заключаны дагаворы аб пастаўках з Бабруйскам і Баранавічамі (там ягады ідуць на віно), з Маларытай (вытворчасць дзіцячага харчавання). Сёлета ўсе ж такі ўраджайнасць меншая. Пакупнікоў больш, чым тых клубніц. З прыватнікамі нам складана спаборнічаць. Нават за дробныя ягады, якія мы бяром для кансервавых заводаў, яны на тысячы дзве даражэй прапаноўваюць.

Самі прыватнікі, праўда, такому высокаму закупачнаму кошту не рады. Але машыну загрузіць трэба, таму, сціснуўшы зубы, згаджаюцца на ўмовы прадаўцоў, якія не хочуць аддаваць плады сваёй працы за бесцань.

ЗЯМЕЛЬНАЯ САМАЗАНЯТАСЦЬ

Спецыяльны рынак у Дварцы, дарэчы, з'явіўся толькі ў гэтым годзе. Аляксандр Віднікевіч прызнаецца, што неабходнасць у ім адчувалася даўно. Пасля стыхійных пунктаў клубнічнага гандлю заставалася шмат смецця, прыбіраць якое прыезджыя аптавікі не хацелі. Але заплаціць патрэбную для навядзення парадку суму скупшчыкі былі згодны. Улады выдзелілі пад рынак кавалак зямлі і шукалі інвестара, якія б узяўся за арганізацыю. І нарэшце знайшлі. Прадпрымальнік Ігар Пракаповіч згадзіўся ўкласці ў гэты аб'ект свае сродкі. Калі пытаем яго пра акупнасць такіх інвестыцый, кажа, што гэта доўгія грошы, разлічваць на хуткі прыбытак не даводзіцца. Але аб'ект перспектыўны. Зараз непадалёк будуецца траса М-10. Калі зрабіць з яе цывілізаваны з'езд, то рынак у міжсезонне можна выкарыстоўваць як стаянку для фур.

— Вадзіцелям з доўгай дарогі патрэбен шэраг паслуг. Тут яны змогуць прыняць душ, паесці, пакінуць машыну пад вартай на ноч, — дзеліцца планамі на будучыню Ігар Іванавіч. — Ужо сёння на рынку ўстаноўлены відэанагляд, працуюць вартаўнікі. Калі зрабіць падобную стаянку якасна і сучасна, на яе будзе попыт. Гэта складана, і раённай уладзе не пад сілу, разлічваем, што ідэю падтрымаюць на абласным узроўні.

Месца для нарыхтоўшчыкаў на рынку платнае. За дзень для легкавога аўтамабіля 75 тысяч, — для «легкавушкі» з прычэпам, мікрааўтобуса і грузавога транспарту 150 тысяч. Ігар Іванавіч мяркуе, што на гандаль станоўча ўплывае любая арганізацыя:

— Пакупнікі задаволены, яны цяпер стаяць на чыстай асфальтаванай пляцоўцы. Для тых, хто здае клубніцы, ад рынку таксама ёсць плюс, бо тут — канкурэнцыя, барацьба за вытворцу, магчымасць патаргавацца. Мы ўдзячны мясцовым жыхарам, якія аказалі нам давер і пайшлі на рынак. Ведаеце, гэта працавітыя людзі, яны заслугоўваюць дапамогі.

Вялікай колькасці фермераў раённая ўлада толькі рада. «Гэта, у першую чаргу, самазанятасць насельніцтва, — адзначае **намеснік старшыні райвыканкама Уладзімір КАВАЛЕВІЧ**. — А калі людзі яшчэ і зарабляюць на сваіх гаспадарках — чым дрэнна?»

Прыбытак ягады, сапраўды, даюць неблагі. Знаёмыя неяк расказвалі пра фермера з Драгічына (яшчэ адзін клубнічны райцэнтр), які на грошы з ураджаю пабудаваў сваёй сям'і кватэру ў Брэсце. У Лунінцы і яго ваколіцах таксама добра жывуць. Палеская глыбінка выглядае па-еўрапейску прыгожа і ўтульна. Але, думаю, любы, хто спрабаваў працаваць на зямлі, разумее, як гэта цяжка. Свая гаспадарка патрабуе шмат сіл (у тым ліку і фізічных). Давесці зямельны надзел да ладу аднаму чалавеку немагчыма. Гэта, бадай, адна з прычын, чаму лунінецкія сем'і не раз'язджаюцца (так, у Дварэцкім сельсавеце, у 13 вёсках, жыве 5,8 тысячы чалавек!). Дый навошта пакідаць зямлю, якая корміць?

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by
Мінск — Лунінецкі раён — Мінск

Маленькая Лера з вёскі Цна дапамагае бацькам збываць салодкі ўраджай.

Пакупнікоў сёння шмат, таму прадаўцы выбіраюць, каму здаць клубніцы будзе больш выгадна. Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Дарэчы

Спецыялізацыя рэгіёна адлюстроўваецца і ў мясцовых святах. Штогод ладзіцца фестываль «Лунінецкія клубніцы» (праходзіў у мінулую суботу). Народныя ўмельцы прэзентуюць мастацкія вырабы на ягадную тэматыку, а кулінары — разнастайныя стравы з клубніц: сочыва, морсы, жэле, печыва.

Аляксандр АНДАРАЛА

Мікалай ЗАПРУДСКІ

Мікалай БАШКО

Алена РАДЗЕВІЧ

Тамара МАЦКЕВІЧ

Іван ЯКІМЕНКА

Яўген ГРЫГОР'ЕЎ

НАСТАЎНІК:

Ці стане педагог у беларускім грамадстве медыйнай асобай

Платон казаў: «Калі шавец будзе дрэнным майстрам, то дзяржава ад гэтага не пацерпіць, а вось калі грамадзян будуць выхоўваць дрэнныя, недасведчаныя настаўнікі, то мы пацерпім ад гэтага ўсе». Дык ці можа быць непрэстыжнай прафесія настаўніка? Хто і што робіць яе прэстыжнай? Што трэба зрабіць, каб у школу прыйшлі прафесіяналы? Якую кар'еру можа зрабіць настаўнік? І, нарэшце, як затрымаць маладых спецыялістаў у сістэме адукацыі? Аб усім гэтым ішла гаворка падчас «круглага стала», які прайшоў у рэдакцыі газеты «Звязда». Удзел у дыскусіі ўзялі першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта Аляксандр АНДАРАЛА, прафесар кафедры педагогікі і менеджменту Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Мікалай ЗАПРУДСКІ, старшыня Мінскага абласнога камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Мікалай БАШКО, начальнік Цэнтра прафесійнага развіцця і інавацыйнай адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Алена РАДЗЕВІЧ, намеснік старшыні Таварыства беларускай школы, кіраўнік праграмы «Настаўнік. Школа. Грамадства», рэдактар інфармацыйна-метадычнага сайта для педагогаў nastaunik.info Тамара МАЦКЕВІЧ, настаўнік матэматыкі і інфарматыкі Лошніцкай гімназіі Барысаўскага раёна, суперфіналіст конкурсу «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь—2011» Іван ЯКІМЕНКА, настаўнік англійскай мовы сярэдняй школы г.п. Дамачава Яўген ГРЫГОР'ЕЎ.

ПРЭСТЫЖ НЕ НА СЛОВАХ

— Як вы лічыце, хто найперш павінен клапаціцца пра тое, якія людзі прыйдуць заўтра на работу ў школу? Педагагічныя ўстановы вышэйшай адукацыі, бо ім патрэбны студэнты? Адміністрацыя школ разам з настаўнікамі, каб было каму перадаць сваю справу? Ці грамадства, бо школа без настаўніка не можа існаваць? І ці шмат вы ведаеце прыкладаў, калі б вучні вярталіся ў свае школы ўжо ў якасці настаўнікаў?

Мікалай БАШКО:

— Зацікаўлены павінны быць усе, каго вы згадалі, у першую чаргу дзяржава. Будучыня краіны залежыць ад адукацыі. Мы ўсе павінны гэта зразумець і быццам бы разумеем, але калі надыходзіць час размяркоўваць дзяржаўныя грошы, то адукацыя чамусьці адыходзіць на другі план.

Я нядаўна сустракаўся ў Стаўбцоўскім раёне з былой настаўніцай, якая перасягнула ўжо 90-гадовы ўзрост: пацікавіўся ў яе, што трэба зрабіць, каб вярнуць настаўніку ранейшы імідж. «Проста трэба сумленна працаваць», — не задумваючыся адказала мне педагог. Я цалкам згодны — за павышэнне прэстыжу настаўніцкай прафесіі трэба змагацца не на словах. Кожны настаўнік на сваім месцы павінен сумленна выконваць свае абавязкі і не спісваць сваю абыякавасць да справы на нізкі заробак...

У Мінскай вобласці ёсць шмат прыкладаў, калі ў школы вяртаюцца працаваць педагогамі іх былыя вучні. Так, у Сноўскай школе Нясвіжскага раёна з 44 педагогаў 15 — маладыя спецыялісты. Асноўную іх частку складаюць выпускнікі гэтай жа школы. Два пераможцы абласнога конкурсу «Педагагічны старт» — таксама выпускнікі сваіх навучальных устаноў: настаўніца беларускай мовы СШ № 8 горада Жодзіна Юлія Гудкоўская і настаўніца англійскай мовы гімназіі №1 горада Барысава Ірына Макрыцкая. Як прызналася Ірына, яна не бачыць сябе ў іншай прафесіі.

Іван ЯКІМЕНКА:

— У жніўні 2011 года Барысаўскі раён прымаў папаўненне — сярод маладых педагогаў, размеркаваных у наш рэгіён, было 8 выпускніцы Лошніцкай гімназіі, прычым двое з іх вярнуліся, каб працаваць у роднай установе. Выпускніца класа, дзе я працаваў класным кіраўніком, таксама скончыла матэматычны факультэт педагагічнага ўніверсітэта і цяпер працуе ў Барысаве настаўніцай матэматыкі.

Аляксандр АНДАРАЛА:

— Калі будзе добры настаўнік, то будзе і добры інжынер, і добры касманаўт, і добры ўрач. Таму клапаціцца пра будучыню нашай школы павінны ўсе. І настаўнікі проста абавязаны думаць, хто прыйдзе ім на змену. Школы павінны хварэць за гэта душой! Летась па выніках прыёму ў нас на першым месцы па колькасці першакурснікаў аказалася Мінская вобласць (34% ад агульнай колькасці навабранцаў), на другім месцы — Брэсцкая вобласць (18%), а мінчан сярод першакурснікаў было ўсяго толькі 14%. Такую колькасць даў амаль двухмільённы горад, дзе сёння востра стаіць патрэба ў педагогах па шэрагу напрамкаў падрыхтоўкі.

Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт мэтанакіравана праводзіць прафарыентацыйную работу, і яе вынікі мы адчулі ўжо падчас леташняй прыёмнай кампаніі. У 2014 годзе да нас паступілі 100 медалістаў, а перад гэтым іх было ў пяць разоў менш. Да таго ж сярод першакурснікаў было 200 ліцэістаў і гімназістаў, гэта значыць, што якасць абітурыентаў значна палепшылася. Зразумела, што ад якасці «тканіны» залежыць, які «шынель» мы ў выніку пашыем. Педагагічны ўніверсітэт адкрывае педагагічныя класы ў Мінску і Мінскай вобласці. А з верасня ў Мінскай вобласці пачнуць працаваць тры педагагічныя гімназіі: на базе маладзечанскай гімназіі №7, салігорскай гімназіі №1 і стаўбцоўскай гімназіі №1. Ёсць прапанова даць магчымасць выпускнікам педагагічных класаў паступаць на педагагічныя спецыяльнасці без дадатковых іспытаў, зразумела, пры наяўнасці характарыстыкі педагагічнага калектыву навучальнай установы. Спадзяёмся, што ў наступным годзе гэтая прывілея будзе ўзаконена.

НЕ АДСТАЦЬ АД ЖЫЦЦЯ

Тамара МАЦКЕВІЧ:

— Праводзілася міжнароднае даследаванне статусу настаўнікаў у розных краінах свету. Высветлілася, што павага да прафесіі настаўніка залежыць у большай ступені ад культурных традыцый, чым ад узроўню жыцця настаўніка. У еўрапейскіх краінах толькі ад 10 да 25% апытаных лічаць, што вучні паважаюць настаўнікаў. Менш як 20% немцаў гатовы прапанаваць сваім дзецям кар'еру настаўніка, а ў Ізраілі толькі 8% апытаных могуць уявіць сабе сваё дзіця ў ролі педагога. Тым не менш у большасці краін людзі упэўнены, што настаўнікам трэба плаціць больш. Ва ўсіх 20 краінах, уцягнутых у даследаванне, больш як 59% апытаных упэўнены, што праца настаўніка павінна аплачвацца ў адпаведнасці з поспехамі яго вучняў. Цікава, што чым вышэйшыя ў краіны вынікі ў матэматыцы, прыродазнаўчых навуках і чытанні, тым меншае жаданне ствараць падобную сістэму аплаты. Агітацыя за мадэль аплаты «па тэстах вучняў» уласцівая якраз краінам з нізкімі вынікамі.

Праводзіліся і іншыя даследаванні, аўтары якіх сцвярджаць, што статус настаўніка быў высокім у першай палове XX стагоддзя, свайго максімуму ён дасягнуў недзе ў 50-60-я гады, а потым стаў зніжацца. Ёсць меркаванне, што так адбылося таму, што сістэма адукацыі перастала адпавядаць сучасным патрабаванням. І сёння паўсюдна ствараюцца механізмы, каб усё грамадства магло стымуляваць найлепшае ў адукацыі: бацькі — праз школьныя саветы, студэнты — праз выбар выкладчыка і курса, які ён чытае, настаўнікі — праз выбар дырэктара школы, працадаўцы — праз уплыў на змест навучання...

Яўген ГРЫГОР'ЕЎ:

— Я нячаста бываю ў сталіцы, таму мяне зацікавіла, якія прафесіі рэкламуюцца ў метро: маладых людзей запрашаюць у міліцыю, у выратавальнікі. Гэта медыйныя прафесіі. І я ўпэўнены, што для таго, каб педагог стаў папулярным у грамадстве, ён павінен стаць медыйнай асобай.

НАЙВЫШЭЙШЫ ПІЛАТАЖ

— Але прафесія настаўніка — адна з самых масавых. Ёсць меркаванне, што масавыя прафесіі рэдка бываюць прэстыжнымі... Дапамажыце разбурыць стэрэатып у масавай свядомасці пра педагога як чалавека, які проста не змог рэалізаваць сябе ў больш прэстыжнай сферы...

Мікалай ЗАПРУДСКІ:

— Не месца ўпрыгожвае чалавека, а чалавек месца. Гэта прымаўка мае самае непасрэднае дачыненне да настаўніцкай прафесіі. Тысячы настаўнікаў дэманструюць на сваім прыкладзе найвышэйшы пілатаж у прафесіі. Да такіх Педагогаў з вялікай літары адносіцца і Юрый Дзмітрыевіч Ляшчынскі: яго былыя вучні настолькі паважаюць свайго настаўніка, што выдалі за свае грошы напісаную ім цікавую і карысную для настаўнікаў фізікі кнігу па рашэнні задач, якую ён цяпер бясплатна распаўсюджвае на сустрэчах з калегамі. Педагагічная дзейнасць — увогуле патэнцыяльна творчая прафесія. Ці раскрые настаўнік гэты патэнцыял, залежыць і ад яго, і ад таго, ці створаны ў школе ўмовы для творчай самарэалізацыі. А калі ўсё забівае руціна, калі настаўніку даводзіцца выконваць шмат незразумелай работы, якая ніяк не ўплывае на якасць адукацыі, а толькі адцягвае яго ўвагу ад галоўнага, адбываецца прафесійнае выгаранне.

Тамара МАЦКЕВІЧ:

«Сапраўды, прафесія педагога масавая — у сферы адукацыі працуюць 11-12% ад усяго працаздольнага насельніцтва, але менавіта наша прафесія дае магчымасць стаць шырока вядомым як сярод прафесіяналаў, так і ў грамадстве. Ці шмат мы ведаем выбітных юрыстаў, эканамістаў або бухгалтараў? А імя Аляксандра Маркавіча Фельдмана, які больш за паўстагоддзя выкладае школьнікам матэматыку, вядома не толькі людзям, звязаных з матэматыкай. Трапіць да такога педагога ўсе лічаць вялікай удачай. Увогуле, у педагогіцы шмат «зорак». Самых творчых і неабыякавых прадстаўнікоў школы аб'яднаў клуб «Крыштальны журавель». Яго члены выязджаюць у розныя рэгіёны краіны, праводзяць для настаўнікаў адкрытыя ўрокі, майстар-класы, ладзяць фестывалі педагагічнага майстэрства. Настаўніца фізікі з першай жодзінскай гімназіі Эла Якубоўская кажа: «Калі я праводжу майстар-клас, а напрыканцы мне дзесяць хвілін апладзіруюць 70 педагогаў, мая самаацэнка і сацыяльны статус адразу павышаюцца». Мяркую, што і вучні Івана Якіменкі, якія абралі педагагічны шлях, зрабілі гэта таму, што бачылі перад сабой упэўненага, самадастатковага і паспяховага чалавека.

Іван ЯКІМЕНКА:

— Калісьці я ўдзельнічаў у конкурсе «Класны класны» і прапанаваў на ўзроўні жарту: а давайце даплачваць настаўніцкім сем'ям, каб яны сваіх дзяцей аддавалі ў настаўнікі. Сам я вырас у сям'і педагогаў. Магілёўскі педагагічны інстытут скончылі мае бацькі, старэйшы брат, старэйшая сястра, жонка старэйшага брата, былы муж сястры. Можна сказаць, што ў мяне не было іншага выбару. Але я ўсё ж такі вырашыў падстрахавацца і спачатку скончыў Аршанскае педагагічнае вучылішча па спецыяльнасці «настаўнік працоўнага навучання і чарчэння», каб пераканацца ў правільнасці свайго кроку. Пераканаўся *(смяецца. —* **Аўт.***)*, і ўжо потым паступіў у педагагічны ўніверсітэт.

Алена РАДЗЕВІЧ:

— А сёння Іван мае ўжо вышэйшую катэгорыю «настаўнік-метадыст» і ўзначальвае клуб маладых настаўнікаў «Будучыня», створаны пры «Беларускім педагагічным таварыстве».

Яўген ГРЫГОР'ЕЎ:

— Я яшчэ малады настаўнік, але ўжо другая мая вучаніца выбірае прафесію педагога. Калі пасля ўдзелу ў конкурсе «Малады настаўнік Брэстчыны» да мяне падышла вучаніца і запыталася, якую вышэйшую навучальную ўстанову я заканчваў, шчыра скажу, мне было вельмі прыемна. У псіхалогіі ёсць паняцце «атракцыя»: псіхолагі лічаць, што любы з нас прасцей успрымае пункт гледжання таго чалавека, да якога ён добра ставіцца і з якім у яго склаліся добрыя ўзаемаадносіны. Гэта значыць, што паспяховы настаўнік у школе мае большы ўплыў на сваіх вучняў і іх бацькоў, чым любыя сродкі масавай інфармацыі. Ён становіцца аб'ектам для пераймання.

ПРАВІЛЬНЫ ПІЯР

— У кожнай прафесіі, у тым ліку і педагагічнай, ёсць выпадковыя людзі, для якіх паняцце «прафесійны гонар» — пусты гук. Але менавіта яны ў многім фарміруюць негатыўны імідж. Як можна зменшыць колькасць такіх выпадковых людзей у педагогіцы?

Алена РАДЗЕВІЧ:

— Абараніць школу ад выпадковых людзей дапаможа здаровая канкурэнцыя. Каб маладыя людзі хацелі паступаць у педагагічныя ВНУ, а потым працаваць у школе, перад вачыма вучняў павінны быць адпаведныя прыклады: сучасны настаўнік — паспяховы малады чалавек (дзяўчына ці хлопец), які можа дазволіць сабе вандраваць, займацца спортам, сучасна апранацца, чалавек, які чытае сучасную літаратуру, ходзіць у тэатры, свабодна валодае сучаснымі гаджэтамі. І чым больш будзе такіх прыкладаў, тым больш старшакласнікаў перастануць глядзець на прафесію педагога як на неперспектыўную. Чаму ўвогуле выпускнікі педагагічных ВНУ вяртаюцца ў школы, дзе яны навучаліся? Мяркую, што з прычыны той атмасферы, якая там панавала, праз настаўнікаў, якія натхнілі іх на прафесійны выбар.

Пры прыёме на работу павінен быць прадугледжаны сацыяльны пакет для настаўнікаў, як гэта адбываецца на прадпрыемствах або ў бізнес-кампаніях: у яго можа ўваходзіць, напрыклад, абанемент у басейн, праязны білет на ўсе віды транспарту, гадавая падпіска на газету «Звязда». Найлепшых настаўнікаў можна заахвочваць стажыроўкай у суседняй краіне або ў найлепшых установах нашай краіны. Няхай крытэрыі паспяховасці выпрацоўвае Савет школы, у склад якога ўваходзяць педагогі, навучэнцы і прадстаўнікі бацькоўскай грамадскасці. Паспяховасць не можа вымярацца толькі колькасцю падрыхтаваных настаўнікам пераможцаў алімпіяд і конкурсаў. Скажам, класнае кіраўніцтва ў праблемным класе, дзе ёсць шмат «цяжкіх» вучняў, не менш важнае і адказнае. На працягу года ў школе можа праводзіцца маніторынг, а пераможца выбіраецца рашэннем Савета школы. Калі маладыя людзі адчуюць паважлівае стаўленне да сябе, матэрыяльную стабільнасць, магчымасць весці паўнавартасны лад жыцця, прэстыж прафесіі вырасце. Педагагічнай прафесіі патрабуецца граматны піяр.

НЕ БЫЦЬ ВІНЦІКАМІ

— У рэаліях нашага часу вобраз настаўніка ў вачах бацькоў, а значыць, і грамадскасці, у большай ступені фарміруецца дзецьмі, з якімі ён штодня кантактуе. Сёння настаўнік-няўдачнік, настаўнік-аўтсайдар, які пастаянна скардзіцца на нізкі заробак і цяжкія ўмовы працы, адназначна ўспрымаецца дзецьмі як адмоўная мадэль жыцця. Як вы лічыце, што трэба зрабіць нашым настаўнікам, каб вярнуць сабе прызнанне і павагу?

ПРАФЕСІЯ ЦІ МІСІЯ?

Мікалай БАШКО:

— Змены павінны адбыцца ў свядомасці саміх настаўнікаў, паколькі многія з іх, на жаль, лічаць, што займаюцца непрэстыжнай і малааплатнай працай. Між іншым, настаўнік ніколі вялікіх грошай не зарабляў, але статус абавязваў да самапавагі і годнасці. А ці мае годнасць настаўнік, якога паставілі адкрываць дзверы перад членамі высокапастаўленай дэлегацыі? Сумняваюся... Школа павінна займацца тым, чым яна павінна займацца: вучыць і выхоўваць. Я нічога не маю супраць конкурсу юных інспектараў дарожнага руху, але сёння гэтае мерапрыемства становіцца ці не галоўным у школе. І такіх прыкладаў можна прывесці дзясяткі. Ва ўстанове адукацыі і ў рэгіёне павінен быць моцны кіраўнік, які не пабаіцца сказаць «не» шматлікім інстанцыям, якія спрабуюць перакласці на школу сваю работу. Сёння любы кіраўнік спрабуе паказаць сваю ўладу над настаўнікам.

Тамара МАЦКЕВІЧ:

— Калі настаўнік перастане, нарэшце, выконваць чужыя абавязкі, у першую чаргу — бацькоў, расправіць крылы і будзе адчуваць сябе больш упэўнена, стаўленне да яго адразу зменіцца. Непавага да настаўніка — гэта элемент маралі сучаснага грамадства і яго сістэмы каштоўнасцяў. Праблема ў тым, што ў вачах абывацеляў настаўнікі — гэта вінцікі ў вялікай машыне, якія не маюць уласнага меркавання. Пастаянныя праверкі, непатрэбная паперавытворчасць, неабходнасць выпрошваць у бацькоў грошы на рамонт школы, запаўненне справаздач... Кантроль патрэбны не для кантролю, а для дапамогі і паляпшэння вынікаў!

«Наша прафесія супрацьпаказана людзям, арыентаваным на атрыманне хуткага выніку. Педагогіцы ўласцівае такое паняцце, як «адтэрмінаваны вынік».

Чаму, скажам, у Фінляндыі прэстыжна працаваць настаўнікам? Таму што там ёсць разуменне: грамадства давярае педагогу самае каштоўнае — сваю будучыню, а праца настаўніка — гэта ўкладанні ў чалавечы капітал. Адна мая сяброўка і калега, калі гаворка заходзіць пра нізкі сацыяльны статус педагога, адказвае: «Не, не чула!» І можа дадаць сабе пад нос, каб не шакіраваць суразмоўцу: «А ваш сын адпачываў на Балі?» Не, яна не з мільянераў. Настаўніцкая сям'я: абодва выкладаюць у гарадской школе і атрымліваюць звычайны настаўніцкі заробак. Проста мае сябры даўно зразумелі, што яны — трымальнікі больш каштоўных акцый, чым грошы. Менавіта яны могуць зрабіць унёсак у той самы чалавечы капітал, а для гэтага трэба не стаяць на месцы, пастаянна развівацца, быць цікавымі і сучаснымі. Старэйшы сын, маючы такіх бацькоў, набраўся розуму, выйграў шмат конкурсаў і з даследчымі вучнёўскімі працамі аб'ехаў паўсвету. У тым ліку пабываў і на Балі...

Атрымліваецца, што чалавечы капітал прыносіць і матэрыяльныя дывідэнды. Добрае імя настаўніка трэба аднаўляць тэрмінова. Спачатку трэба дбаць пра ўласны статус, а потым прыйдзе час і супольнага. Толькі матэрыяльным заахвочваннем справа не вырашыцца. Шмат залежыць ад нас саміх: ад умення пастаяць за сябе, ад нашай згуртаванасці, жадання вярнуць у школу маральныя каштоўнасці, прафесійную этыку.

ПРАЦУЕМ НА КОЛЬКАСЦЬ, А НЕ НА ЯКАСЦЬ

Яўген ГРЫГОР'ЕЎ:

— З прафесійнай этыкай у нас і сапраўды праблемы. Я працую ў сельскай школе, дзе вучацца ў тым ліку і дзеці педагогаў. І вось раптам педагог перастае быць педагогам і становіцца проста мамай: пачынае выказваць незадаволенасць адзнакамі свайго дзіцяці, крытыкаваць іншага педагога. Як увогуле можна абмяркоўваць з дзецьмі іншых настаўнікаў? Яшчэ горш, калі бацькі пачынаюць крычаць на настаўніка або дырэктара школы. «Калі настаўнікі дазваляюць крычаць адзін на аднаго, дык чаму я не магу пакрычаць на настаўніка?» — прыкладна так, напэўна, разважаюць людзі. У сельскай школе ўсе і ўсё навідавоку, таму настаўнікам трэба моцна задумацца над мадэллю сваіх паводзінаў.

Што тычыцца праверак школы... Іх сапраўды шмат, а вось праверак якасці адукацыі — няшмат, а школе трэба вяртацца менавіта да якасці адукацыі. Мы сталі цэнтрам, на які ўсе перакладаюць свае задачы. Я працую намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце. Планую сваю працу на паўгода—год, а потым за дзень ці тыдзень па электроннай пошце прыходзяць 10 лістоў з указаннямі, якія ты павінен абавязкова выканаць. І вось усе твае планы разбураны. Атрымліваецца, што мы працуем на колькасць, а не на якасць. Я лічу, што нельга ў кожнай школе рэалізоўваць на 100 працэнтаў усе напрамкі дзейнасці. У мяне 250 дзяцей, а ў суседняй школе, скажам, 1000 дзяцей. І мы, таксама як і нашы суседзі, павінны закрываць усе мерапрыемствы, што нам спускаюць? У школе ёсць 60 вучняў-актывістаў, з іх 30 удзельнічаюць ва ўсіх мерапрыемствах...

Алена РАДЗЕВІЧ:

— Вельмі шмат намаганняў па ўдасканаленні школы былі накіраваны на рамонт і напаўненне прыгожымі стэндамі кабінетаў, падрыхтоўку новых падручнікаў і метадычных дапаможнікаў, закупку дарагога абсталявання, але не на саміх настаўнікаў. Гэта ўсё, безумоўна, важна, але на якасць адукацыі наўрад ці паўплывае. Можна напісаць выдатную справаздачу, памяняць вокны на шклопакеты, шторы на жалюзі, але за гэтым нічога не стаіць. Галоўнае для школы ўсё ж такі паляпшэнне самой якасці выкладання. А гэта магчыма толькі праз пастаянную самаадукацыю педагогаў, павышэнне ўласнай прафесійнай самаацэнкі. Аўтарытэтам у вучняў і іх бацькоў будзе карыстацца настаўнік, які дасканала валодае сваім прадметам, эрудзіраваны, мае шырокі кругагляд і веды ў сумежных галінах.

НЕ ХУТКІ ВЫНІК

— Абітурыентам па 17-18 гадоў. Як зразумець, хто з іх зможа стаць сапраўдным настаўнікам, а каму гэтая прафесія проціпаказаная? І ўвогуле, ці можна стаць настаўнікам, проста набыўшы педагагічную спецыяльнасць?

Алена РАДЗЕВІЧ:

— Добрым настаўнікам можна быць, нават не скончыўшы педагагічную ВНУ. Прыгадайце пасляваенныя часы, калі школьныя прадметы выкладалі франтавікі, і іх вучні з удзячнасцю захоўваюць памяць пра сваіх педагогаў. Мяркую, што гэтая прафесія супрацьпаказана людзям, арыентаваным на атрыманне хуткага выніку. Такія людзі часцей раздражняюцца, калі ў іх вучняў штосьці не атрымліваецца, калі педагагічныя намаганні, па іх меркаванні, не апраўдваюць сябе. Педагогіцы ўласціва такое паняцце, як «адтэрмінаваны вынік». Старажытнарымскі філосаф Сенека калісьці сказаў: «Каго багі жадаюць пакараць, таго яны робяць педагогам». Ён выдатна ведаў кошт настаўніцкага хлеба, бо быў настаўнікам Нерона. Настаўнік — гэта стан душы, гэта лад жыцця і думак, гэта філасофія і светапогляд.

Мікалай ЗАПРУДСКІ:

— У некаторых краінах перад прыняццем ва ўніверсітэт усе будучыя педагогі праходзяць спецыяльнае інтэрв'ю, падчас якога выкладчыкі спрабуюць высветліць, як чалавек будзе весці сябе ў той ці іншай сітуацыі, як ён будзе рэагаваць на магчымую крытыку з боку навучэнцаў ці іх бацькоў, як будзе паводзіць сябе з так званымі «цяжкімі» вучнямі. Там звяртаюць увагу не толькі на акадэмічную паспяховасць прэтэндэнтаў, але і на іх маральна-псіхалагічныя якасці, без якіх педагог не можа адбыцца. Але ж у нашых умовах, улічваючы невысокую цікавасць моладзі да педагагічных прафесій, ёсць пагроза, што пры ўвядзенні дадатковага прафадбору колькасць абітурыентаў можа зменшыцца.

Я нядаўна гутарыў з дырэктарам Альхоўскай школы Астравецкага раёна Сяргеем Анатольевічам Гаўрыловічам. У сярэдніх класах вучні яго школы ў гэтым годзе мелі магчымасць паспрабаваць сябе ў 9 прафесіях, запатрабаваных на рынку працы, у тым ліку, безумоўна, настаўніцкай. Магчымасць прафесійных спроб яшчэ падчас навучання ў школе — вельмі эфектыўны механізм, які дазваляе зменшыць колькасць памылак пры выбары будучага профілю навучання і будучай прафесіі. Пажадана, каб адукацыйнае і прафесійнае самавызначэнне дзяцей адбывалася да заканчэння базавай школы. Таму няхай бы ў школах як мага часцей вучні сярэдніх класаў спрабавалі праводзіць урокі, пазакласныя мерапрыемствы са сваімі аднакласнікамі, з малодшымі вучнямі. Няхай бы ўцягваліся ў розныя педагагічныя праекты. Такім чынам і самі вучні, і настаўнікі будуць бачыць, у каго ёсць цікавасць і, галоўнае, здольнасці да педагагічнай работы.

ПЕДАГОГІ ПАКАЛЕННЯ «NEXT»

— Маладыя настаўнікі прызнаюцца, што ў школе ёсць шмат чаго, чаму студэнтаў не вучаць ва ўніверсітэтах. Напрыклад, як наладжваць стасункі не толькі з дзецьмі, але і з іх бацькамі. Яны скардзяцца на адсутнасць у першы год работы падтрымкі з боку старэйшых калег. Маладыя педагогі баяцца паказацца ў калектыве «белай варонай», выскачкай, якой трэба найбольш за ўсіх. Акрамя таго, абвяшчэнне сваёй уласнай пазіцыі можа мець для смельчака непрыемныя наступствы...

Яўген ГРЫГОР'ЕЎ:

— Напэўна, нельга ва ўніверсітэце падрыхтаваць да ўсяго — настаўнік проста павінен быць гатовы да пастаяннага самаразвіцця і ўдасканалення. Калі я навучаўся, нам давалі шмат тэарэтычных ведаў, вось толькі магчымасцяў прымяніць іх было няшмат: на педагагічную практыку адводзілася зусім няшмат часу. У мяне ёсць прапанова, як адпрацаваць псіхалагічныя аспекты работы будучага настаўніка. Таму што калі мы прыходзім на ўрок, то ў першую чаргу павінны ўстанавіць з дзецьмі сувязь, і толькі калі яна будзе наладжана, можна перадаваць вучням свае веды. Я вучыўся ў Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце, і за пяць гадоў навучання на педагагічнай практыцы ў аздараўленчым летніку мы былі ўсяго адзін раз... Асабіста ў мяне няма праблем у стасунках ні з дзецьмі, ні з іх бацькамі. Але я быў з дзецьмі ў летніку сем разоў, бо я хацеў там быць, і для мяне ён аказаўся тым месцам, дзе я навучыўся працаваць у дзіцячым калектыве, а дзеці ў атрадзе самыя розныя, як і ў класе... Калі ты працуеш у летніку, то будзеш выступаць у самых розных амплуа (арганізатарам, рэжысёрам, мастаком-афарміцелем, псіхолагам, спартсменам, бардам, паэтам, акцёрам), але гэта ідзе будучаму педагогу толькі на карысць.

Аляксандр АНДАРАЛА:

— Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт ідзе ў нагу з часам. Мы разумеем, што практыкаарыентаванасць навучання павінна быць большай, таму ў гэтым годзе (пакуль у якасці эксперыменту) прынялі рашэнне пачаць укараняць педагагічную практыку ўжо з другога курса: студэнты трох нашых факультэтаў (матэматычнага, фізічнага і прыродазнаўчага) адзін дзень у тыдзень праводзяць у школе. А з наступнага навучальнага года збіраемся ўвесці валанцёрскую практыку ўжо на першым курсе, а потым у студэнтаў будзе ўжо педагагічная практыка. Такім чынам, усе гады свайго навучання нашы студэнты будуць займацца практычнай педагагічнай работай. Мы разумеем, што шмат залежыць ад кіраўніка практыкі, ад таго, наколькі фармальна ці нефармальна ён ставіцца да сваёй работы. Педпрактыка не павінна быць імітацыяй, таму вельмі ўважліва выбіраем базу для праходжання практыкі нашымі студэнтамі.

«Паспяховы настаўнік у школе мае большы ўплыў на сваіх вучняў і іх бацькоў, чым любыя сродкі масавай інфармацыі».

Што тычыцца працы ў летніках, то за нашымі студэнтамі выстройваюцца чэргі. Асабліва іх чакаюць, калі адкрываецца першая аздараўленчая змена, а школьныя педагогі яшчэ не вызваліліся ад сваіх абавязкаў на асноўнай рабоце. Мы ідзём насустрач і дазваляем студэнтам здаць сесію датэрмінова. Цудоўна разумеем, што сучасны настаўнік не можа быць проста «ўрокадацелем». Ён яшчэ і выхавальнік. А калі педагог будзе яшчэ і цікавым чалавекам, нешта прапаноўваць, арганізоўваць, то дзеці будуць за ім бегаць. Педагагічная практыка ў летніках і сапраўды вельмі карысная.

Алена РАДЗЕВІЧ:

— А я хацела б звярнуць увагу ўсіх на наступную праблему: школа не заўсёды гатова прыняць маладога педагога пакалення «next». Для старэйшых калег па прафесіі і для адміністрацыі школы малады настаўнік — часта такі ж дзіўны і незразумелы чалавек, як, скажам, сучасны старшакласнік. Ды і па ўзросце ён ад адзінаццацікласніка не моцна адрозніваецца. Натуральна, малады спецыяліст здзяйсняе шмат прафесійных памылак, ён менш дасведчаны, чым яго калегі, якія працуюць у школе ўжо не першы год. Да таго ж не заўсёды хапае ведаў па прадмеце, па методыцы выкладання, асаблівасцях узроставай псіхалогіі, навыках узаемадзеяння з вучнямі. Аднак замест слоў падтрымкі часта ў яго адрас гучаць абразлівыя пытанні: «І чаму вас толькі ва ўніверсітэце вучылі?» ці «Вы нават ГЭТАГА не ведаеце?» і г.д. А маладому настаўніку — прадстаўніку новага пакалення — неабходны поспех, кар'ера, прызнанне. Такім чынам узнікае супярэчнасць паміж жаданнем самарэалізавацца і абмежаванымі магчымасцямі для яго ажыццяўлення. А ці варта ўвогуле навязваць маладому чалавеку сістэму выхавання, якая была актуальнай у XIX — XX стагоддзях, калі мы імкнёмся да стварэння канкурэнтаздольнай сістэмы адукацыі? Бо вельмі лёгка засвоіць догмы і вельмі складана потым пазбавіцца ад педагагічных стэрэатыпаў у выкладанні. Старая біблейская мудрасць сцвярджае: новае віно ў старыя мяхі не заліваюць. Між іншым, і вопытным настаўнікам ёсць чаму павучыцца ў моладзі, хоць бы ўжыванню розных гаджэтаў, а вучыць маладых настаўнікаў, як рабіць прэзентацыі, увогуле смешна.

НЕ КРЫНІЦА, А ФІЛЬТР

— Ад настаўніка вельмі многага чакаюць. Больш за тое, сям'я сёння спрабуе перакласці на педагога і свае абавязкі. Як вы мяркуеце, ці змянілася кардынальным чынам місія педагога? І якімі якасцямі павінен валодаць сучасны настаўнік?

Яўген ГРЫГОР'ЕЎ:

— Калі раней мы былі кранам — адзінай крыніцай вады, то зараз мы фільтр, а кран пераўтварыўся ў брандспойт. Задача настаўніка — навучыць фільтраваць гэту інфармацыю, знаходзіць у моры непатрэбнай — карысную. Ніхто не жадае ставіць на свой кран брудны фільтр, таму мы першапачаткова павінны быць для сваіх вучняў аб'ектам для пераймання. Раней вучань ішоў да настаўніка, у бібліятэку, а сёння ён адкрывае Google.

Алена РАДЗЕВІЧ:

— Галоўнае, каб сам настаўнік быў гатовы да перамен, да таго, што ён на працягу сваёй прафесійнай дзейнасці павінен развівацца і змяняцца ў залежнасці ад абставін, ад патрэб дзіцячай аўдыторыі. Гэта новае пакаленне, і з гэтым трэба лічыцца.

Мікалай ЗАПРУДСКІ:

— Мы прапанавалі прасунутым педагогам на курсах павышэння кваліфікацыі назваць рысы, якія вылучаюць эфектыўных настаўнікаў. На першае месца яны паставілі стварэнне ўмоў для развіцця індывідуальных здольнасцяў навучэнцаў. Потым — глыбокае валоданне прадметнымі ведамі і ўменнямі, а на трэцяе — паспяховае паступленне выпускнікоў у ВНУ без рэпетытараў і падрыхтоўку пераможцаў алімпіяд. А на апошніх месцах у рэйтынгу аказалася ўменне супрацоўнічаць, арганізаваць клас і ўменне ствараць сітуацыі поспеху для кожнага. Такое ранжыраванне, пэўна, абумоўлена існуючымі ўстаноўкамі з боку кіраўніцтва: пераможцы алімпіяд і конкурсаў — любой цаной! Але ж не гэта ў школе павінна быць галоўным!

ЗДЗЕЙСНЕНАЯ МАРА — ЛЁС

— Уявіце сабе дзяўчынку, якая з дзяцінства марыла стаць настаўніцай. Але яна выросла і стаіць перад выбарам: якую прэстыжную прафесію і якую ВНУ ёй абраць? Дапамажыце знайсці словы, што дапамогуць пераканаць яе зрабіць выбар менавіта на карысць прафесіі настаўніка...

Мікалай ЗАПРУДСКІ:

— Па-першае, чаму менавіта дзяўчынку, можа, лепш хлопца, бо ў школе асабліва не хапае мужчын? Па-другое, важна, хто будзе гэта гаварыць: калі старшакласнікі чуюць агітацыю ад настаўнікаў, якія паспяхова рэалізавалі сябе ў прафесіі, шмат чаго дасягнулі, то плён будзе. Няхай бы ўсе паспяховыя і харызматычныя настаўнікі мелі сваім абавязкам выхаваць некалькі сваіх паслядоўнікаў. Настаўнікі-метадысты, а вы прафарыентацыйную работу праводзіце?

Яўген ГРЫГОР'ЕЎ:

— Я лічу, што, стаўшы настаўнікам, ты назаўсёды застанешся маладым. Гляджу ў вочы сваёй бабулі, якая ўжо шмат гадоў не працуе ў школе, а яны ў яе ўсё такія ж маладыя. У настаўнікаў, якія на пенсіі, па-ранейшаму крыштальны розум і позірк. Хочаш быць заўсёды маладым, быць сярод дзяцей — гэта твой шлях. Гэта ж так цудоўна — ствараць свет дзіцяці і напаўняць яго фарбамі!

Алена РАДЗЕВІЧ:

— Дзякуючы табе, вучні змогуць здзейсніць у будучыні вялікія адкрыцці, дапамогуць чалавецтву пазбавіцца ад хвароб, стаць добрымі людзьмі і змяніць свет да лепшага.

Іван ЯКІМЕНКА:

— Калі ёсць мара, значыць, яе трэба здзейсніць, таму што здзейсненая мара — гэта лёс. Толькі адданасць любімай прафесіі дапаможа стаць шчаслівым чалавекам.

Аляксандр АНДАРАЛА:

— А я хачу дадаць, што педагагічную адукацыю мелі і маршал Савецкага Саюза Іван Якубоўскі, і Пётр Міронавіч Машэраў. Нікому яшчэ веды ў педагогіцы і псіхалогіі лішнімі ў жыцці не былі. Я ведаю, што некаторыя іншагароднія абітурыенты сумняваюцца — ехаць ці не ехаць ім у сталіцу, бо баяцца праблем з жыллём. Хачу іх заспакоіць: усіх іншагародніх першакурснікаў мы забяспечым месцам у інтэрнаце! Так што не сумнявайцеся...

«Круглы стол» правяла Надзея НІКАЛАЕВА.

nikalaeva@zviazda.by

■ Рыштаванні Бацькаўшчыны

З ГЕРБА — У РЭАЛЬНАСЦЬ

У БЯРОЗЕ АДНАВІЛІ БРАМУ, ЯКАЯ ЛІЧЫЦЦА СІМВАЛАМ ГОРАДА

Гісторыя для чалавека пачынаецца тады, калі ён аднойчы разумее: у старым і закінутым будынку ёсць жыццё. Ён не памёр, нягледзячы на тое, што некалькі стагоддзяў не жыў сваім жыццём, некалькі дзясяткаў гадоў не выкарыстоўваўся наогул. Яго цела (сцены) сведчыла пра былую магутнасць, але балела і крывіла, калі губляла свае часткі-цаглінкі-клеткі (як у жывога арганізма), ператвараючыся ў руіны. Аднак усё адно гэта нябачнае і амаль незаўважнае жыццё самотнай істоты.

Для мяне такім жывым арганізмам з'яўляецца Картэзіянскі кляштар у горадзе Бяроза Брэсцкай вобласці. Цяпер — помнік архітэктуры XVII стагоддзя, які знаходзіцца пад аховай дзяржавы. Але так было не заўсёды, у манастыра багатая гісторыя. Пазнаёміцца з ёй — гэта значыць зразумець сэнс існавання такой істоты, як гістарычны помнік: ён дажыў да нашых часоў і можа нешта расказаць, прадставіць мінуўшчыну, якую бачыў. Зразумець яго сэнс — гэта значыць, зразумець лепш сябе. Мне так падавалася ўсе тыя дзесяцігоддзі, што я назірала за рэшткамі манастырскага комплексу ордэна Картэзіянцаў. У помніка былі розныя часы. Але нават у гады майго савецкага дзяцінства, калі з гэтым дзіўным будынкам амаль не звязвалася гісторыя (тады на яго тэрыторыі размяшчалася вайсковая часць), ён вельмі прыцягваў. Мы бегалі вакол, аглядалі высокія чырвоныя сцены і імкнуліся дазнацца: што гэта ўсё ж такое (бо горад у той час рос за кошт тыпавога панэльнага будаўніцтва). Дарослыя распавядалі вельмі прыгожае паданне, якое інтрыгавала яшчэ больш.

Кожны, хто падыходзіць да руін Картэзіянскага кляштара, усё роўна можа адчуць, наколькі ён трымаецца за жыццё.

Сляпы стары і хлопчык, стаміўшыся ад доўгай дарогі, спыніліся на адпачынак сярод бярозак. Стары заснуў, а хлопчык тым часам пайшоў пагуляць. Калі стары прачнуўся, зразумеў, што малога няма, кінуўся на пошукі. Сляпы блукаў, пакуль не пачуў шум імклівай крыніцы. Схіліўся да яе, каб папіць. Змыў стому з твару — і зразумеў, што бачыць. Чысцюткая вада забрала яго хваробу. У памяць пра цуд, які здарыўся ля ракі, тут спачатку ўзнік крыж. А потым сталі славіць Бога і яго ласку да людзей у манастыры. Будаўніцтва яго звязваюць з уплывовым і заможным магнатам Вялікага Княства Літоўскага Казімірам Львом Сапегам (сынам канцлера ВКЛ), якому належалі гэтыя землі.

Гаспадар, шчыры вернік, вырашыў запрасіць прадстаўнікоў ордэна Картэзіянцаў, аднаго са старажытных каталіцкіх ордэнаў, узнікненне якога адносяць да XI стагоддзя. Ордэн вылучаўся вялікай патрабавальнасцю, аскетычным жыццём манахаў, але і працавітасцю, засяроджанасцю на навуцы і ведах, шчыраванням у малітве. Можа таму не надта шмат яго прадстаўніцтваў было ў Еўропе. А вось гэтая бярозаўская «філія» стала ці не самай буйной сярод іншых картэзіянскіх манастыроў. Праўда, для гэтага давялося пастарацца.

Атрымаўшы бласлаўленне на будаўніцтва манастыра, Казімір Леў Сапега запрасіў італьянскага архітэктара Жана Батыста Джыслені. Будаўніцтва пачалося ў 1648 годзе. Гэта была эпоха барока. Пышнасць будынкаў адцяняла ідэі засяроджанасці на недасканаласці чалавека і пошукаў яго шляхоў развіцця ў імкненні да Бога. Манастыр атрымаўся сапраўды пышны, нават калі меркаваць па тых рэштках, якія ад яго засталіся.

Уязная брама Картэзіянскага кляштара ў г. Бяроза да рэстраўрацыі...

...і пасля.

Па-першае, Сапега не пашкадаваў зямлі: тэрыторыя велічэзная. Але і шмат усяго на ёй трэба было размясціць. Корпус, дзе жылі самі манахі (іх лад жыцця нас, сучасных, вельмі здзівіў бы, бо гэта быў аскетызм, які застаўся ў спадчыну ад суровага Сярэднявечча), велічны храм (ад якога, на жаль, нічога не засталося), была бібліятэка, шпіталь (яго рэшткі ёсць) і нават аптэка, шмат гаспадарчых пабудоў (таму што трэба было забяспечваць сябе харчамі, і ў гэтым ім дапамагалі мясцовыя жыхары і іх дзеці, якія працавалі на манастыр). Але асабліва вярэдзілі ўяўленне звесткі пра шыкоўны сад, дзе манахі ўмудраліся вырошчваць нават экзатычныя расліны, і вадаём. У гэтым спакойным маляўнічым месцы пад аховай Бога любіў праводзіць час і сам Казімір Леў Сапега, і яго сямейнікі, нібыта і палац для іх адмысловы быў пры манастыры (а некаторыя з сучасных гісторыкаў вылучалі версію пра тое, што сам Казімір Сапега мог быць пахаваны на тэрыторыі манастыра).

Усе гэтыя пабудовы з вялікай часткай зямлі былі абнесены высокай і добра ўмацаванай сцяной па перыметры: не тое, каб манахі вось так баяліся людзей, што адгароджваліся ад іх, але насамрэч складаны быў час, калі вайна магла прыйсці з любога боку. А манахі-картэзіянцы спадзяваліся не толькі на дапамогу Боскую, яны былі гатовы (і ўмелі) абараняцца ад ворагаў. Паводле некаторых звестак, валадары зямныя звярталіся па пасярэдніцтва манастыра, калі гаворка ішла пра сур'ёзныя супрацьстаянні. Так, у 1706 годзе падчас Паўночнай вайны ў Бярозе адбылася сустрэча Пятра I і караля Польшчы Аўгуста II. Але бывала, што і разбуралі манастыр ворагі, а ён аднаўляўся — і ўсё роўна жыў. Здарылася такое, што хацелі зусім знішчыць памяць пра непакорны манастыр, асабліва пасля паўстанняў XVIII стагоддзя, таму што манахі ўдзельнічалі ў тых падзеях. Закрывалі. Але стаяў як сімвал былых часоў. Руйнавалі (нават казармы для салдат пабудавалі, разабраўшы частку манастырскіх пабудоў). Ён стаў калекам, але ўсё яшчэ быў. Яго імкнуліся скарыстоўваць нават ужо вельмі параненага і амаль нежывога: за савецкім часам на тэрыторыі манастыра месцілася вайсковая часць. Але вялікую частку тэрыторыі вызвалілі — і стала магчыма прайсці праз браму ў двор, агледзець руіны і званіцу, якая знямела за доўгія часы занядбання.

Але кожны, хто падыходзіць да руін Картэзіянскага кляштара, усё роўна можа адчуць, наколькі ён трымаецца за жыццё. Ёсць людзі, якія вельмі хацелі б дапамагчы: некалькі гадоў таму прадстаўнікі мясцовай улады абвясцілі пра планы аднаўлення кляштара. Некалькі гадоў ля брамы, якая вяла ў манастыр, стаялі рыштаванні і віселі папераджальныя таблічкі пра тое, што на аб'екце вядуцца працы.

І вось! У адзін з апошніх прыездаў у родны горад Картэзіянскі кляштар уразіў. Захацелася спыніцца. Першы вынік: адноўленая брама, тая самая, якая вельмі захапляла нас у дзяцінстве. Тая самая, якая стала сімвалам горада Бяроза: красуецца на яго гербе як напамін пра тое, што некалі мы прыходзім у жыццё, недзе атрымліваем разуменне пра яго і, прайшоўшы свой шлях, крочым праз нябесную браму далей. Аднаўленне брамы — пачатак, з якога Картэзіянскі кляштар можа атрымаць новы штуршок да жыцця, калі зноў будзе карысны людзям, таму што патэнцыйна прыцягальны аб'ект для турыстаў (тут недалёка да Сапегаўскіх Ружанаў і да Косава з сядзібай Тадэвуша Касцюшкі і больш познім палацам Пуслоўскіх). Гэта так мяркуецца здалёк. Што будзе далей — вядома, зразумела Богу, але і людзям, якія калі нешта пачыналі, то маюць намер давесці да ладу. І так хацелася б скончыць на аптымістычнай ноце ўсё цяпер. Але сучаснасць і мары Картэзіянскага кляштара вартыя асобнай размовы ў адным з наступных нумароў.

Ларыса ЦІМОШЫК,
tsimoshyk@zviazda.by

Яўгена ПЯСЕЦКАГА
ФОТА СЛОВА

ЧЭРВЕНЬСКІЯ дні 1942 года былі апошнімі для Янкі Купалы. Зямны шлях Песняра трагічна абарваўся. На Вайсковых могілках у Мінску яго постаць (адзіны сюжэт сярод мноства скульптур паэта!) нібы балансуе на мяжы адыходу з жыцця ў нябыт, паміж імгненнем і вечнасцю. Але пра які нябыт можна казаць, калі і сёння гучаць радкі, народжаныя ў яго сэрцы. Жыве і дае нам моц энергетыка яго любові да Радзімы.

Я жыву у вышыні далёкай —
Там, дзе зорак вечнае святло.
Падыміся сцежкай за аблокі,
Уваходзь у сціплае жытло.

Мой прытулак у нябесным полі,
Дзе сцяжынай ўецца
Млечны шлях.
Не гараць пад столяй
жырандолі —
Досыць мне ад месяца святла.

Досыць мне цяпла далёкіх
сонцаў,
Колькі іх — нікому не пазнаць!
Быццам бы на поплаве
бясконцым
Вогнішчы купальскія гараць...

Аддаю стагоддзі за імгненне —
На той луг вярнуцца з небыцця!
Ды няма зямнога прыцяжэння
На абшарах вечнага жыцця.

■ Цікавае побач

САМАВАР — ДУША ДОМА. А ЯНА НЕ ПРАДАЕЦЦА

Так лічылі нашы продкі

У этнакультурным комплексе «Наносы — Наваселле», што на Мядзельшчыне, працуе адзіны ў Беларусі музей самавараў. У яго калекцыі каля 600 розных мадэляў. Такой разнастайнасці і колькасці можа пазайздросціць нават аналагічны музей, што створаны на радзіме самавараў — у Туле.


У адной з залаў музея.

— Гісторыя самавараў пачалася ў 1740 годзе. Менавіта тады на мытні горада Екацярынбурга затрымалі групу купцоў. У іх адабралі 6 кадушак мёду і цікавую пасудзіну пад назвай «самавар». Хоць у яе былі і іншыя найменні: вадагрэй, самакіпец і нават — таўстапузае бажаство. Людзі верылі, што самавар прыносіць у дом шчасце, удачу, спакой. Самыя першыя самавары выкарыстоўваліся не для чаю, а для прыгатавання збіценю, — распавяла экскурсавод Валерыя Ёдчык. — Іх рабілі з медзі, якую здабывалі на Урале. Яе было так многа, што пачалі будаваць заводы, фабрыкі па вытворчасці меднага посуду. Нягледзячы, што такіх прадпрыемстваў узнікла шмат, посуд усё роўна быў вельмі дарагі. Напрыклад, каб купіць чайнік, трэба было цалкам утрамбаваць яго сабалінымі шкуркамі.

Экскурсавод Валерыя Ёдчык ведае пра самавары ўсё.

Фота Надзеі БУЖАН.

Самавары ў музеі — самыя розныя, часам незвычайныя і мудрагелістыя. Напрыклад, на адной з вітрын змешчана звычайная труба.

— На першы погляд, нібыта самавар. Але не зусім так. Гэта спецыяльная ёмістасць для каньяку, — тлумачыць Валерыя. — Асаблівасць прыстасавання ў маленькім непрыкметным кране, накшталт будыйскага сімвалу: нічога не бачу, не ведаю, нічога нікому не скажу. Зроблена гэта для таго, каб нагадаць людзям, што каньяк развязвае язык, а тое, пра што гаварылася за сталом, тут павінна і застацца.

А вось яшчэ цікавыя і ўнікальныя самавары: у выглядзе пеўняў, рога багацця, крэйсера, сумнавядомага «Тытаніка», паравоза. Яны адлюстроўваюць развіццё тэхнікі і навуковага прагрэсу, зроблены па індывідуальным заказе і таму маюць асобы статус. Асноўнае прызначэнне самавараў-бульётак не нагрэць ваду, а падтрымліваць яе ў гарачым стане звычайна з дапамогай спіртоўкі або газніцы. Для іх вырабу часта выкарыстоўваліся і падручныя матэрыялы, пра што сведчыць вялікая прылада з двух медных тазікаў. Усе настолькі хацелі мець адметныя, не такія, як у суседзяў, самавары, што прыдумлялі незвычайныя формы.

Сталіцай самавараў лічыцца Тула. А пачатак іх вырабу паклалі збройнікі. Вытворцы зброі багацелі, грошы трэба было некуды ўкладваць. Менавіта выпуск самавараў стаў перспектыўнай і прыбытковай справай.

У XIX стагоддзі наяўнасць самавара павышала статус дома. Лічылася, той, хто яго мае, — заможны чалавек. Усе імкнуліся купляць два, тры самавары. Карысталіся адным, астатнія былі выстаўлены напаказ, маўляў, гляджу, якія мы багатыя гаспадары. Бясспрэчна, дазволіць сабе такую раскошу маглі далёка не ўсе. На той час сялянскі дом каштаваў 7 рублёў, мяшчанскі — 20, а самавар — ад 7 да 15 рублёў. Гаспадыня часцей за ўсё прадавала сваё жытло, а не самавар, таму што ён лічыўся душой дома, а душа не прадаецца.

На пачатку XIX стагоддзя ў Туле налічвалася каля 25 самаварных фабрык. Але самымі вядомымі вытворцамі былі браты Баташовы. Яны разумелі, што самавар каштуе дорага і не кожны можа ім абзавесціся. Таму спрасцілі канструкцыю і паставілі выпуск на паток. У выніку цана зменшылася і самавары рэалізоўваліся вялікімі партыямі. Дзякуючы братам, доўгачаканая рэч нарэшце з'явілася амаль у кожнай сям'і. Самыя бедныя куплялі яго ў складчыну або нават адзін на ўсю вёску. Калі ў хаце адбываліся хрысціны, вяселле, самавар часова перадаваўся гаспадарам. Але пры гэтым заварвала чай прызначаная захавальніца: лічылася, што самавар слухаецца толькі адных рук.

— Сама гісторыя братоў Баташовых таксама вельмі цікавая. Упершыню заснаваў фабрыку ў 1840 годзе галава сям'і Сцяпан Баташоў, але яна згарэла. Ён не перажыў страты і памёр. Яго старэйшы сын Васіль (на той час яму было 19 гадоў) разам з малодшым 13-гадовым Аляксандрам аднавілі справу бацькі. На ўсіх усерасійскіх выставах яны заваёўвалі залатыя медалі. Нездарма іх называлі каралямі самаварнай справы. Браты мелі права адціскаць на сваім вырабе знак дзяржаўнага герба. Яго мог ставіць той вытворца, які пастаўляў сваю прадукцыю да двара. Гэтага гонару былі ўдастоены адзінкі. Такія самавары прадаваліся на ўра: кожны пакупнік думаў, раз з яго п'е сам цар, то і мне трэба мець такі, — гаворыць Валерыя Ёдчык.

Самавар-паравоз.

Дарэчы, чалавек, які сабраў гэтую калекцыю, нарадзіўся 28 сакавіка, і ў Аляксандра Баташова дзень нараджэння 28 сакавіка. У Валерыі, якая зацікавілася гісторыяй самавараў і праводзіць экскурсіі для шматлікіх гасцей, таксама дзень народзінаў 28 сакавіка. Супадзенне або заканамернасць?

Абсалютна ўсе вытворцы тульскіх самавараў імкнуліся ўдзельнічаць у выставах, дзе маглі атрымаць 1, 2, 3 месцы і адпаведна залаты, сярэбраны, бронзавы медалі. За чацвёртае месца давалі пахвальны ліст. Медалі былі вельмі вялікія, цяжкія і выставіць іх напаказ было праблематычна. Тады прыдумалі рабіць іх адбітак на самім вырабе. Вядома, чым больш медалёў, тым даражэйшы самавар. І ўсе самаварных спраў майстры імкнуліся займець як мага больш медалёў. Часам прыбягалі да хітрыкаў: з медаля, што ўдавалася заваяваць падчас выставы, рабілі некалькі адбіткаў на самавары. І ніхто на гэта не звяртаў увагі. А вось зарабіць гонар змяшчаць герб на сваіх вырабах было значна цяжэй. Але і тут прадпрымальныя людзі знайшлі выхад. Справа ў тым, што адваротны бок медаля ўпрыгожваў дзяржаўны герб. Сімволіку павялічвалі ў размерах, адціскалі ў цэнтры самавара.

Бясспрэчна, прадукцыя братоў Баташовых стала брэндам. Таму многія вытворцы карысталіся іх імем, знаходзілі людзей з аналагічным прозвішчам, плацілі ім невялікія грошы і ставілі «Баташоў» на самавары (а ў дужках — вельмі маленькімі літарамі прозвішча сапраўднага вытворцы). Таму сёння можна ўбачыць шмат нашчадкаў, пераемнікаў, захавальнікаў ідэі Баташовых. Калі братам надакучыла такое махлярства, яны звярнуліся ў суд. У выніку быў складзены спіс з 30 чалавек, якія незаконна выкарыстоўвалі прозвішча Баташоў. Але прыйшла рэвалюцыя, і ўсё прыватнае стала грамадскім. І на прадукцыі тульскіх патроннага завода, завода «Штамп» не было неабходнасці пісаць імя братоў Баташовых.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

«Лявоніха» на беразе Ангары

Тры складнікі поспеху беларускай дыяспары ў Іркуцку

Пра аднаго з самых актыўных беларусаў замежжа, стваральніка Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага Алега РУДАКОВА я чула даўно, а вось пазнаёміцца асабіста выпала на VI з'ездзе Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Расіі ў Маскве. Спадар Алег распавёў шмат цікавых рэчаў пра дзейнасць нашых суайчыннікаў у Прыбайкаллі.

— Беларуская супольнасць у Іркуцку лічыцца адной з самых актыўных і прадуктыўных у Расіі. Як вам гэта ўдаецца?

— Перш за ўсё, мы лічым, што кожная беларуская суполка павінна вывучаць беларускую мову, бо гэта — аснова нашага народа. Па-другое, вывучаць і праводзіць беларускія народныя святы, бо гэта адначасова і інтэрактыў, і захаванне традыцый, а разам з тым узнікае патрэба і ў нацыянальных строях, і ў танцах, і ў рамёствах... Усё гэта мы робім у комплексе падчас правядзення народных святаў. Бо пад што людзям танцаваць на Купалле — пад «бугі-вугі» нейкія? Гэта нецікава. А «Лявоніха», полька, «Кракавяк» — іншая справа. Мы ўсё гэта вывучаем, я сам праводжу майстар-класы, магу і вас навучыць — ведаю 20 беларускіх танцаў як народных, так і сярэднявечных.

А трэці складнік — гэта гістарычная спадчына. Бо калі ты не ведаеш гісторыю свайго народа, ты не шануеш сваіх продкаў. Я, нават калі ў арміі служыў яшчэ за савецкім часам, заўважаў: напрыклад, два ўкраінцы сустрэнуцца — і яны ўжо сябры, іх вадой не разальеш. А беларусы сустрэнуцца: «Здароў!» — «Здароў!» — «Ты адкуль?» — «З-пад Гомеля!» — «А я — з-пад Полацка!» — і разышліся. Такія ўжо нейкія некампанейскія беларусы! А ўсё таму, што мы не ведаем сваёй гісторыі. І калі я пачаў яе вывучаць, зразумеў, якія намаганні рабілі продкі, каб наш народ захаваўся. Столькі было войнаў, столькі ворагаў захоплівалі нашу тэрыторыю, і нягледзячы ні на што, беларускі народ выстаяў. І калі нашы продкі захавалі для нас культуру, то цяпер наша задача — зрабіць гэта для нашчадкаў. І вось калі кожная беларуская суполка возьме за аснову тры складнікі, гэта дасць магчымасць актыўна працаваць і далучаць да сябе моладзь.

— Так, апроч іншага, вядома, што сярод іркуцкіх беларусаў шмат актыўнай моладзі.

— Увогуле ў Іркуцку ўжо тры беларускія суполкі, у якія агулам уваходзіць каля 1,5 тысячы чалавек. Ва ўсіх ёсць свой актыў, бо мы разрасліся, лідараў шмат, і ў кожнага з іх ёсць жаданне сябе праявіць. Апроч таго, у нас ёсць аддзяленні беларускіх суполак па Іркуцкай вобласці, гэта вынік маёй 19-гадовай працы. Цяпер я ўжо нават не старшыня ніводнай з суполак, проста актыўна працую ў моладзевым клубе «Крывічы».

— Раскажыце падрабязней пра мерапрыемствы, якія вы ладзіце.

